ЧЫРВОНКА
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.
30 ЖНІЎНЯ 2012 г. ЧАЦВЕР № 167 (27282) Кошт 1300 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**«У той момант я вельмі хацела абняць маму, але яна была ў глядзельнай зале. Шукала яе вачыма і стрымлівала слёзы, бо разумела, што мяне будуць фатаграфаваць».**



**Адным з месцаў, дзе школьнікі могуць самарэалізавацца без клавіятуры і мышкі, застаецца Дзіцячая чыгунка.**

## БЕЛАРУСЬ АТРЫМАЛА ПЕРШЫЯ КАСМІЧНЫЯ ЗДЫМКІ СА СВАЙГО СПАДАРОЖНІКА

**Цэнтр кіравання палётамі атрымаў першыя здымкі паверхні Зямлі з беларускага касмічнага апарата, паведамілі ў прэс-службе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

Выпрабаванні беларускага спадарожніка разбіты на тры буйныя часавыя адрэзкі, кожны з якіх займае да 30 дзён. Спачатку спецыялісты праводзяць настройкі апаратуры. Пасля гэтага пераходзяць да лётна-канструктарскіх выпрабаванняў і праверкі на адпаведнасць патрабаванням тэхнічнага задання. Яшчэ 30 дзён патрэбна для заліковых выпрабаванняў і здачы заказчыку тэхнічнага комплексу.

Беларускі спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі запушчаны 22 ліпеня 2012 года з касмадрома Байканур у Казахстане. Ён забяспечыць поўнае пакрыццё тэрыторыі Беларусі касмічнай здымкай. З дапамогай уласнага спадарожніка Беларусь планує не толькі задаволіць унутраныя патрэбнасці ў касмічных здымках, але і прадаваць іх іншым краінам. Зацікаўленасць у беларускай касмічнай інфармацыі ўжо выказваюць некаторыя краіны, у тым ліку Азербайджан і Венесуэла. Тэрмін актыўнага існавання беларускага касмічнага апарата складае пяць гадоў.

**БЕЛТА.**

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +20° |
| Віцебск | +17° |
| Гомель | +18° |
| Гродна | +19° |
| Магілёў | +17° |
| Мінск | +17° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.08.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8410,00 | ▲ |
| Еўра | 10550,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 262,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1036,74 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

Фота БЕЛТА



## СВЯТА — КОЖНАМУ ПЕРШАКЛАСНІКУ!

**Дабрачынная акцыя «Партфель першакласніка» завяршылася ў Мінску: у кінатэатры «Піянер» адбылося ўручэнне сабраных падчас акцыі школьных набораў 270 дзецям, якія выхоўваюцца ў шматдзетных малазабяспечаных сем'ях і пойдуць у верасні ў першы клас. Арганізатарамі акцыі выступаюць камітэт па працы, занятасці, сацыяльнай абароне, галоўнае ўпраўленне спажывецкага рынку, камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама, гарадская арганізацыя БРСМ і Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў. Мэта — дапамагчы сабраць у школу дзяцей са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў.**

**НА ЗДЫМКУ: Таня і Паліна атрымалі школьныя наборы.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ПАШЫРЭННІ НАМЕНКЛАТУРЫ ЎЗАЕМНЫХ ТАВАРНЫХ ПАСТАВАК З АЗЕРБАЙДЖАНАМ»

**Беларусь і Азербайджан дамовіліся прапрацаваць магчымасць сумеснага экспарту тавараў на рынкі трэціх краін. Гэту тэму 29 жніўня абмеркавалі кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка і азербайджанскі лідар Ільхам Аліеў, паведаміў БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Прэзідэнт Беларусі асабіста праводзіў высокага азербайджанскага госця ў Нацыянальным аэрапорце Мінск, дзе і адбылася іх размова, якая падвяла вынік афіцыйнага двухдзённага візіту Ільхама Аліева.

Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні наменклатуры ўзаемных таварных паставак з Азербайджанам, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што напярэдадні адбыліся інтэнсіўныя і плённыя перамовы на вышэйшым узроўні, падчас якіх з'явіліся новыя прапановы па пашырэнні беларуска-азербайджанскага ўзаемадзеяння па многіх напрамках. Бакі дамовіліся аб прыездзе ў Баку восенню беларускай дэлегацыі і дэталёвым абмеркаванні тых ініцыятыў, аб якіх ішла размова ў ходзе візіту ў Мінск азербайджанскага лідара.

«Скажу шчыра: вядома, мы хацелі б, каб беларускія тавары, узровень якасці якіх адпавядае сусветнаму, прысутнічалі на азербайджанскім рынку. Мы ў сваю чаргу аддадзім перавагу ў Беларусі азербайджанскім таварам пры ўсіх роўных умовах», — зазначыў Прэзідэнт Беларусі. Ён удакладніў: «Лічу, у гэтым ёсць вялікі сэнс, калі ў нас няма ніякіх перашкод ва ўзаемным гандлі».

СТАР. 2

Міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА:

## «ТРЭБА БОЛЬШ АБ'ЕКТЫЎНА АЦЭНЬВАЦЬ ПРАЦУ РАБОТНІКАЎ БЮДЖЭТНАЙ СФЕРЫ»



**Ці дасягнуць зарплаты беларусаў да канца года абяцаных 500 долараў? На што ўплывае павышэнне бюджэту пражытковага мінімуму? Наколькі праца беларускіх бюджэтнікаў эквівалентная іх зарплаце? Учора міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА падчас прамой тэлефоннай лініі і анлайн-прыёму адказала на пытанні, тых хто звярнуўся да яе.**

СТАР. 4

**ПРОДАЮТСЯ ОБЪЕКТЫ**
возможное использование
– ТУРИЗМ, ОТДЫХ
– УСЛУГИ
– ПРОИЗВОДСТВО
Удобное месторасположение.
Земельные участки – 2,7 га; 5,2 га; 8,9 га.
Минский р-н и область.
**Тел. 8 029 664 77 97.**
УНП 690021581

## КОРАТКА

У Беларусі стаіць задача да канца 2015 года давесці ўдзельную вагу мясцовых відаў паліва і аднаўляльных крыніц у кацельна-пячным балансе да 28-30%, паведаміў намеснік міністра энергетыкі Міхаіл Міхадзюк. Па 2011 годзе мы маем 23%. Да 2020 года ставіцца задача выйсці на 34%.

Пажар у інтэрнаце аграрнага каледжа Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны стаў прычынай эвакуацыі 50 чалавек позна ноччу.

Двое мужчын упалі ў калодзеж з вадой у Гродзенскай вобласці, паведамілі ў МНС Беларусі. Інцыдэнт адбыўся ў вёсцы Орля Шчучынскага раёна. Мужчын выцягнулі выратавальнікі, адзін з іх з дыягназам «пераахаладжэнне» шпіталізаваны.

# «БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ПАШЫРЭННІ НАМЕНКЛАТУРЫ ЎЗАЕМНЫХ ТАВАРНЫХ ПАСТАВАК З АЗЕРБАЙДЖАНАМ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У сувязі з гэтым Ільхам Аліеў заўважыў, што ў Азербайджане высока цэняць якасць беларускіх тавараў і маюць намер актыўна пашыраць іх імпарт.

Азербайджанскі лідар падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за гасціннасць і высока ацаніў вынікі праведзенага афіцыйнага візіту ў Мінск. «Мы з вамі абмеркавалі шмат пытанняў, найперш двухбаковага фармату адносін, і бачым вялікі патэнцыял далейшага развіцця супрацоўніцтва», — сказаў Ільхам Аліеў.

Ён лічыць, што ўжо шмат зроблена ў двухбаковых сувязях за даволі кароткі перыяд: у нарошчванні ўзаемнага тавараабароту, ва ўзаемадзеянні ў прамысловай вытворчасці, энергетыцы. «Мы пратэсціравалі розныя шляхі дастаўкі энергарэсурсаў, якія яшчэ нядаўна былі фантастычнымі, і ўсё гэта ўжо стала рэальнасцю», — сказаў азербайджанскі Прэзідэнт.

На яго думку, адзін з галоўных вынікаў візіту — вызначэнне новых шляхоў супрацоўніцтва ў бізнэсе і ўзаемным гандлі. Дарэчы, акрамя раней запланаваных мерапрыемстваў, члены азербайджанскай дэлегацыі наведалі размешчаны побач з Мінскам малочнатаварны комплекс, азнаёміліся з беларускім вопытам развіцця жывёлагадоўлі, які, магчыма, будзе выкарыстаны ў Азербайджане.

Ільхам Аліеў рэзюмаваў, што ёсць шмат сфер, якія пакуль яшчэ не задзейнічаны ў двухбаковых адносінах і дзе ёсць вялікія перспектывы.

Прэзідэнт Азербайджана таксама падкрэсліў: «Вопыт рэалізацыі праектаў з Беларуссю — унікальны. Тэрміны ад прыняцця рашэнняў да іх ажыццяўлення — вельмі сціслыя. Механізмы прыняцця рашэнняў і кантролю ў абедзвюх краінах — ідэнтычныя».

На думку Ільхама Аліева, самае галоўнае, што ёсць, — вялікае ўзаемнае жаданне і далей развіваць адносіны па ўсіх напрамках. Ён выказаў упэўненасць, што ў будучым у Азербайджана і Беларусі з'явіцца шмат новых сумесных праектаў.

У сувязі з гэтым ён заўважыў: «У Азербайджане ўжо ведаюць беларускую якасць, і мы пры роўных умовах будзем аддаваць перавагу беларускім вытворцам, што і прадугледжваюць нашы дружалюбныя адносіны».

Аляксандр Лукашэнка і Ільхам Аліеў дамовіліся арыентавацца на сумесны экспарт тавараў на рынкі трэціх краін.

Прэзідэнт Беларусі прапанаваў: «Мы хочам у Закаўказзе праз Азербайджан, аўтарытэт якога ў рэгіёне вельмі высокі, сумесна выйсці на рынкі іншых, у тым ліку суседніх, краін. Размова, напрыклад, ідзе пра Іран і Турцыю». Кіраўнік беларускай дзяржавы ўдакладніў: «Мы хочам разам з Азербайджанам не толькі з беларускімі, але і з азербайджанскімі, і з сумесна выпрацаванымі таварамі выйсці на рынкі іншых краін у рэгіёне. Гэта быў бы значны прарыў і вялікая выгада».

Ільхам Аліеў падтрымаў гэту прапанову. «Мы зацікаўлены ў гэтым, таму што праз пэўны час наш унутраны рынак будзе забяспечаны ўнутранай вытворчасцю. Такую задачу мы паставілі, і пытанне выхаду на знешнія рынкі, тэма экспартнага патэнцыялу будзе стаяць вельмі востра, калі мы хочам развівацца далей. А мы, зразумела, хочам», — сказаў Прэзідэнт Азербайджана.

«Я вітаю ваша рашэнне па прыярытэтным супрацоўніцтве Беларусі з Азербайджанам, і для гэтага ёсць усе перадумовы. Разам мы можам зрабіць многае», — лічыць азербайджанскі лідар.

Ён падкрэсліў, што тэма арыентаванасці на рынкі трэціх краін будзе ў ліку абмяркоўваемых на наступным пасяджэнні сумеснай беларуска-азербайджанскай гандлёва-эканамічнай камісіі, якое ў будучым годзе, як плануецца, пройдзе ў Баку. «Там будуць разглядацца дасягнутыя ў Мінску на вышэйшым узроўні дамоўленасці і будзе прааналізавана магчымасць сумеснага выхаду на рынкі трэціх краін», — адзначыў Ільхам Аліеў.

Азербайджанскі лідар сказаў, што з вялікім аптымізмам і вялікімі планамі вяртаецца з Мінска і ўжо ў Баку дасць неабходныя ўказанні ўраду, каб усе рашэнні былі ажыццёўлены ў тэрмін.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што беларускі бок у сваю чаргу будзе дакладна і своечасова выконваць усе дамоўленасці з Азербайджанам.

**Первичная организация профсоюза ОАО «Минсклифт» ликвидируется.**
Претензии принимаются в течение двух месяцев со дня публикации объявления. **Тел. 8 017 298 24 69.** УНП 100507647

**СЕНИЦКИЙ СЕЛЬИСПОЛКОМ**
**проводит запрос ценовых предложений на покупку:**
автомобиля Chevrolet Captiva LT Plus AWD AT6 двигатель (2.4 123 кВт/167 л.с.), 2012 года выпуска. Заявки на участие в процедуре запроса ценовых предложений принимаются в течение 10 дней со дня опубликования объявления по адресу: Минский р-н, аг. Сеница, ул. Набережная, 64.
**Контактные телефоны: (8 029) 34 11 826, (8 017) 506 11 14, тел./факс (8 017) 506 16 83.** УНП 600052409

Считать недействительными страховые сертификаты «Зеленая карта» серии BY/12/7504304, 6776604; квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС № 3344233, 3339479; страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 7227940, 5451595, 8921946 СООО «Белкоопстрах» ф-ла в г. Могилеве. УНН 100706519

## У выхадныя ў Глыбокім святкуюць Дзень беларускага пісьменства

# «...НЕ ТЭХНАЛОГІІ ПАВІННЫ КЛАСЦІ ДЗЯЦЕЙ СПАЦЬ, А БАЦЬКАВА АЛЬБО МАТУЛІНА СЛОВА...»



**Такую параду бацькам дала Лілія Ананіч, першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі напярэдадні Дня беларускага пісьменства. Хоць можна лічыць, што свята ўжо пачалося. Яно рушыць па краіне. Учора са Свята-Духавага кафедральнага сабора выправілася ў шлях навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў» з Дабрадатным Агнём ад Гроба Гасподняга. Экспедыцыя павінна прыехаць у Глыбокае — і там з набажэнства ў праваслаўным храме пачнецца святкаванне чаканай падзеі.**

### Беларусы шмат чытаюць

Беларусь — краіна, якая шмат чытае. «Мы моцна трымаем на постсавецкай прасторы высокую пазіцыю, выдаючы амаль чатыры кнігі на кожнага жыхара Беларусі, — сцвярджае Лілія Ананіч. — Вядома, сучасныя тэндэнцыі ўплываюць на стан кнігавыдання, на колькасныя паказчыкі, але гэта агульнасусветная сітуацыя. Электронная кніга павялічвае армію сваіх чытачоў. Таму апошнія гады звязаны са змяншэннем выпуску друкаваных кніг. Аднак пры гэтым за шэсць месяцаў 2012 года ў Беларусі было выдадзена 5379 найменняў кніг. Агульны тыраж — 16,7 мільёна асобнікаў. Хоць сёння ёсць электронная кніга, не страчана цікавасць грамадства да звычайнай друкаванай кнігі». Ды і дзяржава клапоціцца аб беларускім кнігавыданні: сёлета, у Год кнігі, у першым чытанні ў парламенце быў прыняты праект закона аб выдавецкай дзейнасці. Акрамя таго, зараз на стадыі завяршэння падрыхтоўка ўказа Прэзідэнта краіны аб падтрымцы нацыянальнага кнігавыдання.

У межах дзяржаўнага заказу штогод друкуецца шмат так званых «сацыяльна значных» кніг. Сёлета плануецца выдаць іх каля 120-130 найменняў: кнігі серыі «Школьная бібліятэка», кнігі беларускіх аўтараў з мэтай папаўнення публічных бібліятэк (упершыню пры ўмове стапрацэнтнай дзяржаўнай датацыі), падручнікі. За дзяржаўныя сродкі выдаюцца кнігі для дзяцей са слабым зрокам, для чаго ў мінулым годзе была сур'ёзна ўмацавана тэхналагічная база.

Дарэчы, працу нашых выдавецтваў добра ацэньваюць паўсюль. «Мы ганарымся тым, што наша нацыянальная кніга годна прадстаўляецца на шматлікіх міжнародных выставах. На Міжнародным конкурсе мастацтва кнігі краін СНД, які нядаўна адбыўся ў Астане, нашы выданні атрымалі шмат дыпломаў. Другі год запар нам даюць Гран-пры», — паведаміла першы намеснік міністра інфармацыі.

### Чаго чакаць падчас свята?

Вядома, цэнтральнымі падзеямі святкавання будуць юбілеі з дня нараджэння тытанаў беларускага слова Якуба Коласа, Янкі Купалы і Максіма Танка. Упершыню будзе праводзіцца конкурс юных чытальнікаў Глыбоцкага раёна па творах класікаў беларускай літаратуры «Жывая класіка». Ініцыятарамі конкурсу сталі Міністэрства інфармацыі, Глыбоцкі райвыканкам, газета «Звязда», РВУ «Літаратура і Мастацтва» і рэдакцыя часопіса «Вясёлка». З дапамогай конкурсу паспрабуюць высветліць, наколькі дзеці цікавяцца зараз кнігай, ці шмат чытаюць. Гэты конкурс надалей стане рэспубліканскім. «Вельмі важна, каб дзеці чыталі кнігу, каб бацькі, карыстаючыся новымі тэхналогіямі, не забывалі, што не тэхналогіі павінны класці дзяцей спаць, а бацькава альбо матуліна слова — трэба пачытаць ім казку, апавяданне», — упэўнена Лілія Ананіч.

Абавязкова, на маю думку, трэба наведаць выставу друкаваных рарытэтаў з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка. А адной з галоўных падзей стане традыцыйны Міжнародны «круглы стол» з удзелам пісьменнікаў розных краін «Пісьменнік. Кніга. Час», арганізатарам якой з'яўляецца РВУ «Літаратура і Мастацтва». Па словах Алеся Карлюкевіча, галоўнага рэдактара газеты «Звязда», сёлета будзе ўжо сёмы такі «круглы стол». Удзел бяруць вядомыя паэты, празаікі, драматургі, публіцысты, кнігавыдаўцы з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Туркменістана, Таджыкістана, Казахстана, Сербіі, Чарнагорыі. Да абмеркавання запрошаны і тыя, хто прыязджаў раней, і новыя персоны: напрыклад, вядомы азербайджанскі паэт Чынгіз Алі аглы, творы якога выдаюцца па ўсім свеце.

Між іншым, выдавецтва «Літаратура і Мастацтва» і газета «Звязда» актыўна рыхтуюцца да Дня беларускага пісьменства (як і ўсе іншыя выдавецтвы і сродкі масавай інфармацыі). «У «Літаратуры і мастацтве» выйшлі дзве кнігі, прысвечаныя Глыбоцкаму краю, гістарычным, культурным, асветніцкім традыцыям», — звяртае ўвагу Алесь Карлюкевіч.

**Запрашаем вас, паважаныя чытачы, наведаць Глыбокае, тым больш што звяздоўцы там таксама будуць. Урачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства адбудзецца 2 верасня а 12 гадзіне на цэнтральнай плошчы ў Глыбокім. Але і ў суботу 1 верасня будзе шмат чаго цікавага. У святкаванні прымуць удзел больш за 100 пісьменнікаў краіны. Будуць і аўтограф-сесіі.**

**Прыязджайце!**

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# ВЫЙГРАЎ МІЛЬЁН ЕЎРА. КАБ ГУЛЯЦЬ ДАЛЕЙ



**Беларус Мікалай Пабаль выйграў 1 мільён еўра, стаўшы пераможцам Еўрапейскага покернага тура ў Барселоне. Аднак для Мікалая прыз — не галоўнае: «У кожнага гульца ў покер павінна быць свая грашовая падушка бяспекі», — упэўнены ён. Дзякуючы гэтаму выйгрышу ён працягне гуляць. Ужо ў гэтую нядзелю шчаслівы ўладальнік мільёна еўра прыме ўдзел у сусветным анлайн-чэмпіянаце па покеры.**

Каб атрымаць вікторыю, Побалю давялося абысці прыкладна 1100 гульцоў з самых розных кантынентаў — Еўропы, Азіі, Амерыкі, Аўстраліі. Барселона была толькі першым этапам Еўрапейскага покернага тура, бо спаборніцтвы праходзяць у шасці розных гарадах на працягу года. Аднак гэты тур лічыцца галоўным і самым працяглым. Ён доўжыўся шэсць дзён: кожны дзень з дванаццаці гадзін дня, да гадзіны-дзвюх ночы.

Частку выйграных грошай хлопец збіраецца ўкласці ў інвестыцыйныя праекты, пра якія, аднак, пакуль што казаць не хоча. Таксама плануе зрабіць сабе які-небудзь падарунак — машыну, напрыклад, хоць да гэтага аўтамабілі Павел не любіў. «Хіба што я памяняю сваё стаўленне, калі набуду добрае аўто», — адзначае пераможца. Частку сродкаў, магчыма, ён аддасць на дабрачыннасць.

Каб прыняць удзел у спаборніцтве, трэба было ўнесці 5300 еўра. Малады чалавек распавёў, што ў кожнага гульца павінен быць банкрол — сума, неабходная для таго, каб не трапіць у паласу нешанцавання, калі не будзе на што гуляць, — абаротныя сродкі для гульні. Мікалай жа покерную кар'еру пачынаў, ставячы цэнты, уласных сродкаў ніколі не ўкладваў, таму ўсе яго банкролы цалкам выйграны. Гэты ж прыз, зразумела, таксама паспрые развіццю покернай кар'еры маладога чалавека.

Да гэтага ў Побаля былі і іншыя буйныя выйгрышы, самы вялікі з іх — 70000 еўра. Аднак усе прызавыя ён укладаў у тое, каб удзельнічаць у яшчэ больш прэстыжных і дарагіх гульнях. І толькі з гэтага мільёна еўра хлопец нарэшце адважыцца штосьці патрацціць проста так.

Мікалай скончыў Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Два гады ён сумяшчаў працу па спецыяльнасці і гульню ў покер, аднак пасля зразумеў, што, каб нечага дасягнуць, трэба траціць нашмат больш часу. Таму ён сышоў з працы і вырашыў прафесійна заняцца покерам. "Я гуляю ў покер пяць гадоў, — распавёў Побаль. — Я да гэтага вельмі доўга ішоў, патраціў шмат сіл, набываючы вопыт, — на навучанне, трэніроўку».

Да сусветнага анлайн-чэмпіянату па покеры Мікалай будзе рыхтавацца і фізічна, і маральна. З трэнерам у трэнажорнай зале — каб загартаваць вытрымку для 12-гадзіннага сядзення за покерным сталом. Раней пару разоў даводзілася звяртацца і да спартыўнага псіхолага — каб дапамог настроіцца на гульню. Калі пачынаюцца турнірныя серыі, харчаванне таксама павінна быць асаблівым. Мікалай распавёў: «Вялікую ўвагу трэба надаваць спартыўнаму харчаванню, каб не было ніякага тлушчу. Падчас турніру ў Барселоне я кожную раніцу еў малако з мюслямі і садавінай. А пасля 12 гадзін нічога не еў, каб не гублялася канцэнтрацыя. Бо, калі ясі, адразу хочацца адпачыць. А трэба ж кантраляваць працэс».

Падзяліўся пераможца і сваімі прафесійнымі хітрасцямі: «Ёсць шмат невербальных рэчаў, якія прафесіяналы ў людзях бачаць. Змяненне памеру зрэнак, паштурхванні — добры гулец на ўсё гэта звяртае ўвагу. Калі ты праводзіш пэўны блеф і на цябе пачынаюць глядзець, то адчуваеш сябе крыху некамфортна. Пульс павялічваецца дакладна. Захаваць поўны спакой складана, але да гэтага трэба імкнуцца. Самы просты спосаб зразумець блеф — паглядзець на зрэнкі. Не толькі ў покеры, але і ў звычайным жыцці, калі чалавеку штосьці падабаецца, калі ён узбуджаны, тады зрэнкі пашыраюцца. Так і ў гульні: калі сапернік атрымаў добрую карту, яго зрэнкі павялічваюцца. Таму гульцы, каб гэта ўтаіць часам гуляюць у акулярах, часам у капюшоне, хтосьці закрывае рот, каб не было бачна ніякіх змен. Таму, калі садзішся за стол, першая задача сыходзіць на тое, каб пазнаёміцца з сапернікамі, у тым ліку і па тэхніцы гульні, каб пасля супраць іх прадпрымаць пэўныя захады. Аднак я і не карыстаўся такімі сродкамі, бо часам у зале бывае дрэннае асвятленне, і, калі гуляеш у акулярах сам, больш складана сачыць за гульнёй іншых».

За сваю пяцігадовую покерную кар'еру Мікалай Побаль віртуальна і ў інтэрнэце згуляў дзесьці 15000 турніраў. Ён адзначае, што прадказаць перамогу ніколі немагчыма. Аднак галоўная мэта маладога чалавека — паказаць сваю лепшую гульню.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, фота аўтара.**

■ Беларускі парламент: персаналіі

# ВЕКТАРЫ ДЭПУТАЦКАЙ ДЫПЛАМАТЫІ

**Аб пэўных выніках дзейнасці дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання ў блізкім і далёкім замежжы са старшынёй Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Віталем БУСЬКО гутарыць наш карэспандэнт.**



***— Віталь Леанідавіч, наколькі я ведаю, у будынку Дома ўрада створана пастаянная музейная экспазіцыя, прысвечаная дзейнасці Палаты прадстаўнікоў. Якія падзеі, факты з яе дзейнасці на міжнароднай арэне за апошнія чатыры гады вы б унеслі ў аналы гісторыі?***

— Ці інакш кажучы, якія галоўныя вехі ў справе развіцця міжнародных стасункаў Палаты прадстаўнікоў за гэты перыяд? Ведаеце, усе вартыя ўвагі падзеі цяжка пералічыць. Іх было шмат. Спынюся на тым, што, на мой погляд, цікавым будзе для чытачоў. Гэты перыяд быў адзначаны далейшым умацаваннем аўтарытэту нашага парламента за мяжой, узбагачэннем новым зместам былых сувязяў з даўнімі партнёрамі, усталяваннем новых цікавых і перспектыўных кантактаў.

Адным з дасягненняў нашага парламента лічу падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з Дзяржаўнай Думай Расіі. Шэсць гадоў мы ішлі да гэтага. Хоць, здавалася, навошта такое пагадненне пры наяўнасці Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі? Тым не менш гэты дакумент дазваляе канкрэтызаваць сумесную працу і больш эфектыўна каардынаваць работу па вырашэнні праблем інтэграцыі, пабудовы Саюзнай дзяржавы. Важным крокам лічу таксама падпісанне мемарандума з Кітаем аб супрацоўніцтве. Хочацца вызначыць і актывізацыю парламенцкіх адносін з Азербайджанам. Яшчэ адносна нядаўна яны насілі фармальны характар. Цяпер набылі канструктыўны дзелавы характар, адрозніваюцца ўзаемнай павагай і падтрымкай.

***— Як вядома, наша дыпламатыя шматвектарная. А на якіх кірунках дзейнасці засяроджаны дэпутаты?***

— Я вылучыў бы два асноўныя кірункі дзейнасці нашых дэпутатаў за мяжой. Першы — удзел у рабоце дэлегацый міжнародных парламенцкіх фарміраванняў. Увогуле мы ўдзельнічаем у рабоце 14 міжнародных парламенцкіх арганізацый. Маем намер пашырыць кола партнёраў. Напрыклад, зараз працуем над атрыманнем статусу назіральніка пры Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў Балтыйскага мора.

Другі кірунак — праца пастаянных камісій і рабочых груп па супрацоўніцтве з парламентамі іншых краін. Нагадаю, сёння мы маем 3 камісіі і 44 рабочыя групы. Камісіі — гэта больш высокі ўзровень адносін. Калі групы працуюць у залежнасці ад абставін, не прытрымліваюцца дакладнага графіка, то камісіі ўжо дзейнічаць на планавай аснове. Іх пасяджэнні праходзяць па чарзе ў сталіцах дзяржаў. Скажам, калі члены камісіі па супрацоўніцтве з парламентам Украіны сустракаюцца ў Мінску, то ў наступны раз — у Кіеве.

За 4 гады ўзрасла колькасць груп па супрацоўніцтве з парламентамі іншых краін. Напрыклад, з'явіліся новыя групы з Венгрыяй, Харватыяй, Эстоніяй, Мексікай, Нікарагуа, Боснія-Герцагавінай, Бахрэйнам, Катарам. Хачу заўважыць, што да нас паступае шмат прапаноў з розных краін аб стварэнні новых груп. Гэты працэс набірае сілу, і ён сведчыць аб росце аўтарытэту беларускага парламентарызму.

***— І ўсё ж якая самая яркая падзея на вашай памяці за перыяд дэпутацтва ў Палаце прадстаўнікоў?***

— На мой погляд, самы вялікі поспех не толькі нашай пастаяннай камісіі па міжнародных справах, але і ўсяго беларускага парламента — атрыманне год таму статусу назіральніка ў такой вядомай і ўплывовай арганізацыі, як Асацыяцыя дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН). Дарэчы, сёлета 22-23 верасня ў сталіцы Інданезіі Джакарце на чарговай сустрэчы членаў АСЕАН будзе ўзняты беларускі сцяг. Перад намі статус назіральніка атрымала Індыя — адзін з эканамічных лідараў Азіі. І тут наступная — Беларусь з Усходняй Еўропы. Невыпадкова факт нашага збліжэння з АСЕАН выклікаў вялікае здзіўленне ў шэрагу краін, якія яшчэ задоўга да нас спрабавалі стаць назіральнікамі пры гэтай арганізацыі. Ведаеце, асабліва запомнілася, як прадстаўнік Канады на 32-й асамблеі АСЕАН у Камбоджы выказаў моцнае здзіўленне тым, што Беларусь стала назіральнікам. І папрасіў мяне растлумачыць гэты феномен. Я аргументаваў проста: на геаграфічнай карце паказаў, што Беларусь тэрытарыяльна знаходзіцца бліжэй да краін АСЕАН, чым Канада. Таксама былі моцна здзіўлены набыццём намі статусу назіральніка і прадстаўнікі Еўрапарламента. Каб яны загадзя ведалі аб гэтым, то, я ўпэўнены, яны зрабілі б усё магчымае, каб не дапусціць збліжэння Беларусі з гэтым дынамічным рэгіёнам планеты. Аднак парламенцкі прарыў нашай краіны ў Паўднёва-Усходнюю Азію ўсё ж адбыўся.

***— І чым нам можа быць карысная АСЕАН?***

— Нагадаю, што гэта адна з самых дынамічных і паспяховых краінавых груповак не толькі ў Азіі, але і ў свеце. Невыпадкова сярод назіральнікаў АСЕАН — Японія, Расія, ЗША, Кітай, Аўстралія, Індыя. Там у нас ёсць значныя эканамічныя інтарэсы і надзейныя партнёры. Дастаткова назваць В'етнам, які сёння называюць «азіяцкім маладым эканамічным тыграм». У Беларусі з гэтай краінай выдатныя палітычныя і дзелавыя адносіны, мы разам ажыццяўляем шэраг значных праектаў, расце ўзаемны гандлёвы абарот. Без перабольшвання, В'етнам — гэта наш плацдарм у Паўднёва-Усходняй Азіі. Дзякуючы статусу назіральніка мы атрымалі доступ на адну з самых прэстыжных пляцовак свету, дзе дыскутуюцца, абмяркоўваюцца і вырашаюцца многія глабальныя пытанні сучаснай эканомікі. Акрамя В'етнама, у нас дынамічна развіваюцца адносіны з М'янмай, Інданезіяй. АСЕАН, нагадаю, ахоплівае краіны з насельніцтвам 650 мільёнаў чалавек. Гандаль паміж краінамі АСЕАН ідзе на трыльёны долараў.

***— Сапраўды, зроблены важны крок да планамернага засваення рынкаў далёкага замежжа. А з якімі міжнароднымі парламенцкімі арганізацыямі мы найбольш паспяхова працавалі?***

— У першую чаргу хачу назваць Міжнародны парламенцкі саюз (МПС). Гэта самая буйная арганізацыя, якая аб'ядноўвае 162 парламенты. Нашы прадстаўнікі актыўна працуюць ва ўсіх структурах МПС: і ў яго пастаянных камітэтах, і на пленарных пасяджэннях. Апошняе адбылося ў сталіцы Уганды. Я там таксама прысутнічаў і магу засведчыць, што беларускія дэпутаты імкнуліся максімальна выкарыстаць магчымасць данесці сваім калегам пазіцыю нашай краіны па ключавых міжнародных праблемах. У прыватнасці, з вялікай увагай было выслухана выступленне намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Патупчыка. Шмат працавалі нашы дэпутаты і ў кулуарах. Заўважу, гэта работа часам дае вялікі плён, выводзіць на новыя карысныя сувязі.

Мы таксама працуем з Парламенцкай Асамблеяй АБСЕ, нягледзячы на тое, што яна нярэдка дазваляе сабе неаб'ектыўную крытыку ў бок Беларусі, несправядлівыя папрокі, рэзалюцыі і г. д. Тым не менш мы імкнёмся выкарыстоўваць трыбуну Асамблеі для распаўсюджвання праўды пра нашу краіну, выкрыцця плётак і выдумак на беларускую тэму. З іншага боку, мы на разгляд Асамблеі выносім свае рэзалюцыі — у прыватнасці, па барацьбе з гандлем людзьмі. Таксама дапамагаем нашым саюзнікам па СНД адстойваць іх інтарэсы ў рамках АБСЕ.

**факт нашага збліжэння з АСЕАН выклікаў вялікае здзіўленне у шэрагу краін**

Зразумела, Парламенцкі сход Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкая Асамблея СНД, Міжпарламенцкая Асамблея ЕўрАзЭС — гэта тыя міжнародныя пляцоўкі, дзе работа нашых дэпутатаў асабліва плённая. Сёння абяцае ператварыцца ў аўтарытэтную і эфектыўную арганізацыю Міжпарламенцкая Асамблея АДКБ. Рыхтуецца палажэнне аб ёй. І я думаю, што з часам на міжнароднай арэне яна заявіць аб сабе ў поўны голас. У гэтай маладой структуры ёсць патэнцыял, які забяспечыць ёй будучыню, а парламентары напоўняць дзейнасць АДКБ, якая ўяўляе сабой ваенна-палітычны саюз, новым зместам.

***— Віталь Леанідавіч, камісія, якую вы ўзначальваеце, мае непасрэднае дачыненне да прызначэння паслоў Беларусі ў замежных дзяржавах. Якія патрабаванні прад'яўляюць дэпутаты да кіраўнікоў дыпламатычных місій?***

— З кожным годам патрабаванні павышаюцца. Наша камісія мае права разглядаць кандыдатуры паслоў і рэкамендаваць іх для прызначэння на гэтую адказную і ганаровую пасаду ў пэўную краіну. Згодна з адпаведным палажэннем, без рашэння камісіі пасол не можа быць зацверджаны. Вось і сёння на маім стале ляжыць стос асабістых спраў будучых паслоў. У першую чаргу мы звяртаем увагу на валоданне кандыдатам у дыпламаты высокага рангу мовамі. Веданне англійскай — абавязковае патрабаванне. Пажадана валодаць яшчэ адной мовай. Па-другое, мы цікавімся тым, наколькі будучы пасол ведае палітычныя традыцыі, эканоміку, культуру, звычаі краіны знаходжання. Па-трэцяе, мы абавязкова пытаемся наконт планаў і намераў новага пасла па збліжэнні народаў дзвюх краін, яго падыходах па павялічэнні гандлёвага абароту, паляпшэнні развіцця культурных, адукацыйных, гуманітарных стасункаў, студэнцкіх і навуковых абменаў. Нярэдка пытанне ставіцца, як гаворыцца, рубам: дзе вы бачыце месца будучага прарыву ў адносінах нашых краін?

Прыемна адзначыць, што ў пераважнай большасці кандыдаты ў паслы валодаюць сітуацыяй у краіне будучай камандзіроўкі, ведаюць мовы, маюць жыццёвы і прафесійны досвед для паспяховай работы за мяжой.

***— Ну, а якія пытанні задаюць вам па тэме дзейнасці камісіі выбаршчыкі? Наколькі іх цікавіць міжнародная праблематыка?***

— Вядома, людзей у маёй акрузе, як і ўсюды, больш за ўсё цікавіць вырашэнне жыццёвых праблем: рамонт дамоў, дарог, тратуараў, адкрыццё новых парковак для транспарту. І гэта зразумела. Але сёння, хачу падкрэсліць, узровень інтарэсаў сярэднестатыстычнага выбаршчыка істотна вырас. Яго ўсё больш хвалююць пытанні развіцця горада, рэгіёна, увогуле краіны. Людзі актыўна цікавяцца праблематыкай Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі, пытаюцца аб перавагах для паляпшэння жыцця звычайных грамадзян працаздольнага ўзросту трох краін, пра новыя магчымасці для сярэдняга і малога бізнэсу. Сённяшні выбаршчык неабыякавы да таго, што пішуць і паведамляюць пра нас замежныя СМІ. І гэта мяне як дэпутата радуе.

Гутарыў
**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# МУС: АБМЕЖАВАННЕ НА ЗНАХОДЖАННЕ ДЗЯЦЕЙ НОЧЧУ НА ВУЛІЦЫ — ГЭТА НЕ КАМЕНДАНЦКАЯ ГАДЗІНА, А СПРОБА ІХ АБАРАНІЦЬ

**Тое, што дзіця, якое не дасягнула 16 гадоў, не зможа знаходзіцца на вуліцы пасля 23.00 без суправаджэння дарослых, з'яўляецца ахоўнай мерай, а не каменданцкай гадзінай, паведамілі ў МУС Беларусі.**

5 верасня ўступіць у сілу пастанова Саўміна № 772 ад 22 жніўня, згодна з якой асобам, якія не дасягнулі 16 гадоў, забараняецца знаходзіцца на вуліцы з 23.00 да 6.00 без суправаджэння дарослых. «Дзіця можа знаходзіцца па-за домам у позні час, але з паўналетнімі (бацькамі, дарослымі братамі або сёстрамі, знаёмымі). Галоўнае, каб бацькі ведалі, дзе і з кім знаходзяцца іх дзеці», — растлумачылі ў МУС. Такія меры дапамогуць абараніць дзяцей ад злачынных замахаў і зменшыць колькасць непаўналетніх, уцягнутых ва ўчыненне злачынстваў, паколькі падлеткі ў гэтым узросце найбольш схільныя да дрэннага ўплыву.

У той жа час абмежаванні, якія ўводзяцца — гэта ніяк не каменданцкая гадзіна, падкрэслілі ў МУС. Міліцыянер не будзе праводзіць затрыманне ў звыкшым сэнсе гэтага слова. Супрацоўнік АУС будзе толькі суправаджаць малалетняга, таму што правапарушэнне ў такіх выпадках дапускаюць бацькі. І менавіта ў дачыненні да іх будуць складацца пратаколы. «Пры сустрэчы непаўналетняга ў позні час на вуліцы супрацоўнік органаў унутраных спраў высветліць яго асобу і ўзрост. Бацькам патэлефануюць, высвятляць прычыну, па якой дзіця адно на вуліцы. Бацькі змогуць прыехаць на працягу 3 гадзін. У адваротным выпадку (напрыклад, месцазнаходжанне бацькоў не ўстанавілі, яны знаходзяцца ў стане ап'янення) дзіця даставяць у сацыяльна-педагагічны прытулак», — расказалі ў МУС. Забраць дзіця можа па даручэнні бацькоў любы дарослы. Міліцыянер патэлефануе бацькам, высветліць магчымасць прыехаць за дзіцем. «Калі атрымаем вусны дазвол на перадачу непаўналетняга, скажам, стрыечнай сястры ці любому іншаму даросламу, то пры прад'яўленні імі пашпарта дзіця адправіцца дадому», — паведамілі ў міністэрстве.

Дарослым, адказным за знаходжанне дзіцяці без нагляду ў позні час, у адпаведнасці з арт.17.13 КоАП Беларусі (невыкананне абавязкаў па суправаджэнні ці забеспячэнні суправаджэння непаўналетняга ў начны час па-за жыллём), пагражае або папярэджанне, або штраф да дзвюх базавых велічынь (адна базавая складае Br100 тысяч). За паўторнае на працягу года парушэнне — ад дзвюх да пяці базавых. Складаць адміністрацыйныя пратаколы будуць супрацоўнікі міліцыі. Разгляд спраў аб названых правапарушэннях аднесены да кампетэнцыі камісій па справах непаўналетніх.

Паводле інфармацыі МУС, толькі за першае паўгоддзе гэтага года ў Беларусі ахвярамі злачынстваў сталі амаль 2 тысячы непаўналетніх. Каля 40 працэнтаў злачынстваў, учыненых дзецьмі ва ўзросце да 18 гадоў, адбыліся ў позні вячэрні і начны час.



Кар. БЕЛТА.

# КАРАГОД ПАЛЕСКАЙ САМАБЫТНАСЦІ:

## Фарбы. Шматгалоссе. Шматаблічча





**НЕ паспелі адгучаць апошнія акорды другога фестывалю этнічных культур на прыпяцкім беразе ў Петрыкаўскім раёне, а яго ўжо назвалі незвычайным і ўнікальным. І для гэтага было нямала падстаў. Хаця б тое, што фестывальныя падмосткі займалі майстры традыцыйных і самых старажытных у рэгіёне рамёстваў, а наўкола гучалі залатыя — не тое што рэдкія — унікальныя галасы Палесся.**

Асаблівую радасць фестываль падарыў самім яго ўдзельнікам, якія з'яўляюцца сённяя носьбітамі, захавальнікамі і пераемнікамі жывой аўтэнтычнай палескай культуры. Сярод іх быў майстар па вырабе дудак і выканаўца народных найгрышаў, жыхар Лунінца Мікалай Яраховіч *(на фота справа)*. Ён сябруе з дудкамі ўжо больш чым паўстагоддзя. Асабліва парадавала сваімі баладнымі песнямі народнае аматарскае фальклорнае аб'яднанне «Світанак» з вёскі Дзятлавічы Лунінецкага раёна, якім шмат гадоў кіруе адданая культуры і традыцыям Алена Яскевіч *(фота ў цэнтры)*. Гэты калектыў не толькі захоўвае песні адышоўшых стагоддзяў, але і працягвае жыццё колішніх свят і абрадаў. Пра адзін з такіх — «Куст» — «Звязда» распавядала на сваіх старонках. За яркі ўдзел і незабыўнае выступленне «Світанак» стаў дыпламантам фестывалю і атрымаў каштоўны падарунак.

Усе фестывальныя падворкі маглі пахваліцца сваімі майстрамі ігры на гармоніку. А вось лепшы выканаўца ігры на бубне аказаўся на падвор'і Ельскага раёна *(фота злева)*.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



■ Футбол

### БАТЭ ЗНОЎ СЯРОД МАЦНЕЙШЫХ

**Чэмпіён Беларусі па футболе другі год запар будзе ўдзельнічаць у Лізе чэмпіёнаў.**

Для таго, каб трапіць у самы прэстыжны клубны турнір Еўропы, БАТЭ хапіла ў гасцях і нічыёй з ізраільскім «Хапаэлем» з Кір'ят-Шманы. Аднак матч для беларусаў атрымаўся цяжкім. І балельшчыкі не ўбачылі палымянай каманды Віктара Ганчарэнкі, якая на мінулым тыдні ўпэўнена перамагла ў Мінску апанента з лікам 2:0. Але ў Рамат-Гане, прыгарадзе Тэль-Авіва, было спякотна, ды і барысаўчане, якія былі ў фаварытах, дзейнічалі на захаванне ліку. Мінскага відовішча ў Ізраілі не было. Быў даволі спакойны, крыху марудны футбол. І карты беларусам ледзь не пераблытаў гол венгра Ленчэ. Пад канец гульні ізраільцяне наогул маглі зраўнаваць лік па ходу двух матчаў, але атрымалі мяч ад Паўлава ў свае вароты. 1:1 — лік, які цалкам задаволіў каманду, але гульня, здаецца, дадала пытанняў трэнерскаму штабу барысаўчан.

— «Хапаэль» — добрая каманда. На гэтай стадыі не бывае клубаў слабога ўзроўню. Але сёння мы змагаліся яшчэ і з кліматам, — прызнаўся Віктар Ганчарэнка, галоўны трэнер БАТЭ.

**Тарас ШЧЫРЫ**

# «ТРЭБА БОЛЬШ АБ'ЕКТЫЎНА АЦЭНЬВАЦЬ ПРАЦУ РАБОТНІКАЎ...»

### Ліпеньская зарплата мінчан ужо перавысіла абяцаны ўзровень

**Віктар Пятровіч, Мінск:** ***Зараз адна з самых топавых тэм навін — заробкі беларусаў і абяцанні, што да канца года іх узровень складзе 500 долараў. Усе бурна абмяркоўваюць гэтую тэму, параўноўваюць, адсочваюць, падлічваюць, прагназуюць... Як вы лічыце, ці рэальна, што заработная плата да канца года дасягне 500 долараў ЗША?***

— Віктар Пятровіч, гаворка ідзе аб усярэдненай велічыні, аб намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай плаце па рэспубліцы, а не пра тое, што ў кожнага работніка заработная плата дасягне ўзроўню 500 долараў.

Цяпер у рэальным сектары эканомікі карэнным чынам змяніўся механізм рэгулявання заработнай платы работнікаў камерцыйных арганізацый. Памеры аплаты працы работнікаў залежаць ад эфектыўнасці працы і фінансавых магчымасцяў камерцыйных арганізацый. Наймальнікам дазволена ўсталёўваць любыя формы, сістэмы і памеры аплаты працы.

Сёлета ў ліпені намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата па рэспубліцы склала 3925,9 тыс. руб. (або 471 долар ЗША) і павялічылася ў параўнанні са студзенем 2012 года на 36%.

Сярод абласцей рэспублікі да ўзроўню 500 долараў наблізіліся Мінская і Гомельская вобласці з намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платай у ліпені 4002,5 тыс. руб. (або 480 долараў ЗША) і 3760,5 тыс. руб. (або 451 долар ЗША) адпаведна. У Мінску ў ліпені намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата перавысіла ўзровень 500 долараў і склала 4962,0 тыс. рублёў (або 595 долараў ЗША).

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

У ліпені гэтага года намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата дасягнула і перавысіла ўзровень 500 долараў ЗША ў такіх відах эканамічнай дзейнасці, як фінансавая — 6291,4 тыс. рублёў (або 755 долараў ЗША); будаўніцтва — 4664,8 тыс. рублёў (560 долараў ЗША); аперацыі з нерухомай маёмасцю, арэнда і прадастаўленне паслуг спажыўцам — 4522,0 тыс. рублёў (543 долары ЗША); транспарт і сувязь — 4511,4 тыс. рублёў (або 541 долар ЗША); прамысловасць — 4362, 0 тыс. рублёў (або 524 долары ЗША).

### Як зарабіць пенсію пры працы за мяжой?

**Зінаіда, г. Чачэрск:** ***Мне прапануюць папрацаваць за мяжой. Умовы даволі прывабныя. Але ці дадуць мне пенсію за гэтыя гады?***

— Калі вы не будзеце выплачваць пенсійныя ўзносы ў Беларусі, то стаж працы за мяжой не будзе ўлічвацца пры прызначэнні вам пенсіі ў нашай краіне. Зінаіда, звярніце ўвагу, што магчымасць выплаты ўзносаў на пенсійнае страхаванне асобамі, якія працуюць за мяжой, існуе. Для гэтага вам неабходна стаць на ўлік у якасці плацельшчыка страхавых узносаў у аддзеле Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны па месцы жыхарства ў Беларусі. Калі ж у нашай краіны з краінай, куды вас запрашаюць на працу, ёсць пагадненне ў галіне пенсійнага забеспячэння, то падлік стажу і выплата пенсіі будуць ажыццяўляцца на ўмовах, замацаваных у гэтым пагадненні. У любым выпадку, рэкамендую вам спачатку знайсці інфармацыю аб працадаўцу. І не забудзьцеся афармляць працоўныя адносіны дакументальна.

**Святлана БУСЬКО.**

*(Працяг будзе.)*


**РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ**
**«Все вкуснее дома с Coca-Cola»**

Всё вкуснее дома с Coca-Cola — РУБЛЁВСКИЙ сеть универсамов

**Организатор рекламной игры:**
**Общество с ограниченной ответственностью «Рефорте»**
**Адрес: Республика Беларусь, 220043, г. Минск, пр. Независимости, д. 95, 6 этаж административного здания, комн. 24.**
**Заинтересованным лицом является ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия», поселок Колядичи, Минский район.**

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2039, выданное Министерством торговли Республики Беларусь 28 июня 2012 г.

Территория проведения рекламной игры – универсамы сети «Рублевский» в городах: Минск, Витебск, Гомель, Гродно, Борисов (Республика Беларусь):

| № | Название | Адрес |
|---|---|---|
| 1. | У-м «Рублевский» №1 | г. Минск, 2-й переулок Багратиона, 18-А |
| 2. | У-м «Рублевский» №2 | г. Минск,ул. Ольшевского, 4 |
| 3. | У-м «Рублевский» №3 | г. Минск, ул. Розы Люксембург, 80 |
| 4. | У-м «Рублевский» №5 | г. Минск, ул. Притыцкого, 56 |
| 5. | У-м «Рублевский» №6 | г. Минск, ул. Романовская Слобода, 14 |
| 6. | У-м «Рублевский» №7 | г. Минск, ул. Калиновского, 67 |
| 7. | У-м «Рублевский» №8 | г. Минск, ул. Янки Лучины, 14 |
| 8. | У-м «Рублевский» №9 | г. Минск, ул. Плеханова, 91 |
| 9. | У-м «Рублевский» №10 | г. Минск, бульвар Шевченко, 18 |
| 10. | У-м «Рублевский» №11 | г. Минск, ул. Кижеватова, 72/1 |
| 11. | У-м «Рублевский» №12 | г. Минск, ул. Кольцова, 32 |
| 12. | У-м «Рублевский» №13 | г. Минск, проспект Партизанский, 48 |
| 13. | У-м «Рублевский» №14 | г. Минск, ул. Розы Люксембург, 163 |
| 14. | У-м «Рублевский» №15 | г. Минск, ул. Рафиева, 81-А |
| 15. | У-м «Рублевский» №16 | г. Минск, ул. Уручская, 11-А |
| 16. | У-м «Рублевский» №18 | г. Минск, ул. Толбухина, 4 |
| 17. | У-м «Рублевский» №19 | г. Минск, проспект Победителей, 1 |
| 18. | У-м «Рублевский» №20 | г. Минск, ул. Сухаревская, 62 |
| 19. | У-м «Рублевский» №21 | г. Минск, ул. Кузьмы Чорного, 34/15 |
| 20. | У-м «Рублевский» №22 | г. Минск, ул. Алтайская, 66-А |
| 21. | У-м «Рублевский» №23 | г. Минск, проспект Рокоссовского, 1 |
| 22. | У-м «Рублевский» №24 | г. Минск, ул. Водолажского, 6 |
| 23. | У-м «Рублевский» №25 | г. Минск, ул. Шаранговича, 25 |
| 24. | У-м «Рублевский» №26 | г. Минск, проспект Пушкина, 12-А |
| 25. | У-м «Рублевский» №27 | г. Минск, ул. Маяковского, 146 |
| 26. | У-м «Рублевский» №31 | г. Минск, ул. Райниса, 17 |
| 27. | У-м «Рублевский» №35 | г. Минск, ул. Славинского, 45 |
| 28. | У-м «Рублевский» №36 | г. Минск, ул. Кижеватова, 7/2 |
| 29. | У-м «Рублевский» №37 | г. Минск, ул. Руссиянова, 36 |
| 30. | У-м «Рублевский» №39 | г. Минск, пр-т Рокоссовского, 114 |
| 31. | У-м «Рублевский» №40 | г. Минск, ул. П. Панченко, 70 |
| 32. | У-м «Рублевский» №43 | г. Минск, ул. Нестерова, 58 |
| 33. | У-м «Рублевский» №28 | г. Гомель, ул. Максима Богдановича, 2 |
| 34. | У-м «Рублевский» №33 | г. Витебск, проспект Московский, 86 |
| 35. | У-м «Рублевский» №32 | г. Борисов, ул. Гагарина , 64 (а) |
| 36. | У-м «Рублевский» №41 | г. Гродно, б-р Ленинского комсомола, 44 |

**Сроки проведения рекламной игры:** с 5 июля по 31 августа 2012 года.

В рекламной игре приняло участие 329 человек.

Призовой фонд рекламной игры разыгран не полностью:

Приз «Холодильник-сувенир» - 8 шт.
Приз «Сумка для покупок» - 590 шт.
Приз «Кухонный фартук» - 379 шт.
Приз «Поднос-подушка» - 125 шт.
Приз «Полотенце пляжное» - 128 шт.

**ПОБЕДИТЕЛИ ПРИЗА** «Холодильник-сувенир»:
Гурский О.И., г. Минск (1 шт.)
Жук Ю.М., г. Минск (2 шт.)
Логинович С.И., г. Минск (1 шт.)
Яско А.А., г. Минск (1 шт.)
Лаврентьева О.В., г. Минск (1 шт.)
Кушнер А.В., г. Минск (1 шт.)
Жаковская В.Д., г. Минск (1 шт.)

Полный список победителей рекламной игры **«Все вкуснее дома с Coca-Cola» опубликован на сайте** www.rublevski.by.

**Справки по телефону (017) 239 06 37 с 9-00 до 21-00.**

*Coca-Cola является зарегестрированным товарным знаком The Coca-Cola Company. © 2012 The Coca-Cola Company. Напиток сертифицирован.*
*ООО «Рефорте» УНП 100422707*

# ЧЫРВОНКА

Чырвоная змена

30 ЖНІЎНЯ 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15702)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Ведай нашых!

# ПРЫГАЖОСЦЬ БЕЗ ІЛЮЗІЙ

**Таленавітая, адкрытая, шчырая і вельмі прыгожая... Наталля Рабава ніколі не марыла быць мадэллю, але жыццё распарадзілася па-іншаму... У 2009 годзе дзяўчына скончыла школу «Агенцтва Сашы Варламава». Удзельнічала ў міжнародных творчых майстэрнях, фотасесіях шматлікіх фатографаў. А сёлета Наташа стала пераможцай конкурсу «Міс Інтэрнэшнл сярод людзей з аслабленым слыхам — 2012», які праходзіў у Анкары (Турцыя), адразу ў трох намінацыях: «Міс Інтэрнэшнл», «Міс Еўропа» і «Міс фота». Між іншым, гэта не адзіная ўзнагарода Наталлі такога высокага ўзроўню, бо летась яна здабыла тытул «Міс Еўропа» на конкурсе Miss Deaf World-2011. Мы сустрэліся з Наталляй і яе мамай Святланай, каб абмеркаваць гэтыя падзеі.**




***— Раскажыце, калі ласка, пра конкурс. Як рыхтаваліся да яго?***

**Наталля**: Конкурс аказаўся нечакана складаным. Два тыдні рэпетыцый: дэфіле, развучванне нацыянальнага танца, інтэрв'ю. Вывучэнне англійскай і міжнароднай жэставай мовы, бо конкурс — сусветнага ўзроўню. Кожны дзень быў непрадказальны. На сон амаль не заставалася часу. З раніцы трэба было быць напагатове — макіяж, прычоска. Галоўнае для канкурсантак — не разгубіцца ў любой сітуацыі...

**Святлана:** З кожным днём атмасфера напальвалася. Але псіхалагічна ўсе адчувалі сябе добра, хоць хваляванне, безумоўна, прысутнічала. Стылістаў і візажыстаў там не было, таму ўсё даводзілася рабіць самім. Варожасць адсутнічала, хоць гэта і конкурс, дзе важна ўмець паказаць сябе.

***— Наколькі лёгка завязваюцца новыя знаёмствы ў такіх умовах?***

**Наталля**: Амаль што імгненна. У кожнага там было жаданне пагутарыць з іншымі, сфатаграфавацца. З многімі мы працягваем сябраваць і пасля конкурсу.

***— Калі параўноўваць мінулагодні конкурс у Празе і сёлетні ў Анкары, то якая перамога далася больш складана?***

**Наталля**: У Празе, напэўна, было лягчэй, бо там мы знаходзіліся крыху ў іншых умовах. З намі быў чалавек, які дапамагаў. Адзенне, купальнікі, абутак — усё прадастаўлялі арганізатары. Сёлета ж увесь антураж быў уласны. Таксама ў Празе не было конкурсу інтэрв'ю.

***— А якія пачуцці былі ў вас, калі даведаліся пра вынік?***

**Наталля**: Было пачуццё неверагоднай свабоды, хацелася ляцець на неба. У той момант я вельмі хацела абняць маму, але яна была ў глядзельнай зале. Шукала яе вачыма і стрымлівала слёзы, бо разумела, што мяне будуць фатаграфаваць.

***— Што, акрамя вопыту і новых знаёмстваў, даў табе гэты праект?***

**Наталля**: Я набыла вопыт кантактавання з людзьмі з розных краін. Гэта надае ўпэўненасці ў тым, што ўсе людзі... аднолькавыя. У мяне з'явілася магчымасць усюды выступаць з гэтай ідэяй. Таксама я выступаю з ідэяй папулярызацыі сваёй краіны. Я распавядаю новым знаёмым пра Беларусь, бо хачу, каб пра нашу краіну ведалі больш, запрашаю ў госці.

***— Як ты трапіла ў мадэльны асяродак?***

**Наталля**: У дзяцінстве я хацела быць урачом, следчым, мне падабалася маляваць... А ў мадэльную школу трапіла, калі пачала вельмі сутуліцца, і нават танцы не дапамаглі выправіць гэта. Я лічу, што ў мадэлі — кароткі век, таму патрэбна займацца чымсьці іншым па жыцці.

**Святлана**: Калі пачалі займацца ў Варламава, ён яе выцягнуў, узяў пад сваю апеку. Нашу першую фотасесію мы рабілі ў Яўгена Канаплёва. І калі ён даведаўся, што Наташа здымаецца ўпершыню, то сказаў: «У нас лічаныя мадэлі працуюць на такім узроўні. Я раіў бы вам заняцца гэтым».

***— Ці ёсць нейкія планы наконт мадэльнага бізнэсу?***

**Наталля**: Мне цяжка марыць, бо я дрэнна чую. А гэты бізнэс — жорсткі, ён не для слабых. Дзяўчаты паміж сабою — канкурэнткі. Ніхто не будзе табе дапамагаць. Я не цешу сябе ілюзіямі.

**Святлана**: Займацца гэтым бізнэсам магчыма тады, калі ёсць людзі, зацікаўленыя ў тым, каб табе дапамагчы. А ў нас гэта пакуль што хобі.

***— Якой Наташа была ў дзяцінстве?***

**Святлана**: Вельмі рухомай дзяўчынкай. Пры гэтым любімым заняткам у яе было пісьмо. Магла гадзінамі сядзець і нешта перапісваць. Для яе была ўласцівая ўпартасць. Але з цягам часу дзіцячая ўпартасць пераўтварылася ў сілу характару. Яна мала гуляла з дзецьмі, бо тыя маглі пакрыўдзіць, аднак ніколі не камплексавала.

***— Як любіш адпачываць?***

**Наталля**: Для адпачынку мне патрэбна ціхае месца. Мне падабаецца чытаць кнігі. Люблю глядзець старыя фільмы. Фільмы Хічкока, напрыклад, мне бліжэй, чым сучасная фантастыка. Яшчэ люблю спаць на сене. Малюю, вышываю карціны.

**Святлана**: У Наташы цудоўна атрымліваецца ўсё, што яна робіць сваімі рукамі. Шые, вышывае, упрыгожвае... Яна здольная ў любую рэч, якая трапляе пад руку, удыхнуць жыццё, зрабіць яе практычнай.

***— Што, на твой погляд, неабходна дзяўчыне, каб быць прыгожай?***

**Наталля**: Галоўнае ў дзяўчыне — прыгажосць яе душы. А яе бачыш, калі глядзіш чалавеку ў вочы.

**Алена ДРАПКО.**

Без стрэсаў

# САКРЭТЫ ШКОЛЬНЫХ ЗАКУПАК

**Адна з самых папулярных напрыканцы жніўня тэм — збіранне дзіцяці ў школу. Мы абмяркоўваем яе з сябрамі, пакідаем адпаведныя каментарыі на разнастайных форумах. І, зазвычай, штогод гаворым пра адно і тое ж — страсці кіпяць у асноўным вакол коштаў і асартыменту. Але ці не накручваем мы сябе на пустым месцы? Калі вы — не бацькі першакласніка, то, напэўна, паспелі ўжо выпрацаваць стратэгію школьных закупак без стрэсаў.**

1. АЖЫЯТАЖ НА ПУСТЫМ МЕСЦЫ?

У апошнія жнівеньскія выхадныя выбіраюцца на школьныя кірмашы. У такі час здаецца, што рабіць закупкі — справа складаная і непрыемная. У аддзелах сталічнага ЦУМа, дзе прадаецца дзіцячы абутак і вопратка, не праціснуцца. Вялікія чэргі ў касы і прымерачныя кабінкі. У цеснаце і духаце складана не тое што выбраць нешта з рэчаў, а нават прабрацца да іх. Бацькі нервуюцца, а дзеці гатовы прыняць ужо любую прапанову, абы хутчэй скончыўся гэты кашмар з прымеркамі школьнай формы.

Спрактыкаваныя бацькі заўважаюць, што асноўнае правіла закупак без стрэсаў — займацца імі загадзя, прычым не ставіць сабе за мэту набыць адразу і ўсё ў адным месцы. І не трэба думаць, што для таго, каб знайсці на дзіця дзелавую вопратку, якая задаволіць вас і памерам, і фасонам, давядзецца аб'ехаць не адну краму. Спецыяльна на працягу лета некалькі разоў заглядала ў розныя месцы, дзе прадаецца адзенне для школьнікаў. І кожны раз знаходзіла рэчы, вартыя ўвагі. Папярэднія «вылазкі» варта рабіць і таму, што асартымент у крамах мяняецца, на працягу лета можна ўбачыць у продажы самыя розныя мадэлі. Варта звярнуць увагу і на школьныя кірмашы. Напрыклад, яны ладзяцца штогод на «Белэкспа» ў апошні тыдзень жніўня. На кірмаш яшчэ варта завітаць, каб параўнаць асартымент і кошты ад розных вытворцаў, тым больш што лічбы на цэнніках могуць значна розніцца. Напрыклад, сарафан на дзяўчынку малодшага школьнага ўзросту можа каштаваць як 100, так і 600 тысяч. За 200-400 тысяч вы можаце набыць на маленькую школьніцу камплект — жакет плюс спадніца (штаны), альбо аддаць толькі за жакет паўмільёна.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ»)*

**І не варта наракаць на адсутнасць густу ў беларускіх вытворцаў. Часам на юных дзелавых лэдзі можна знайсці такую мадэль, што калі былі б падобныя большых памераў, іх не адмовіліся б набываць і дарослыя «офісныя» дамы.**

Эх, правязу!

# ДЗІЦЯЧАЯ ЧЫГУНКА:

## ТАКАЯ ПАТРЭБНАЯ ГУЛЬНЯ Ў РЭАЛЬНАСЦЬ



**Ува век камп'ютарызацыі і інтэрнэту дзеці сталі ўсё менш часу праводзіць на вуліцы. Асабіста ў мяне сапраўдную павагу выклікаюць юнакі і дзяўчаты, якія знаходзяць для сябе цікавае па-за межамі электроннага свету. Адным з месцаў, дзе школьнікі могуць самарэалізавацца без клавіятуры і мышкі, застаецца Дзіцячая чыгунка імя К.С. Заслонава. Карэспандэнты «Звязды» накіраваліся на станцыю Заслонава, каб даведацца, чым сёння жыве «Малая Беларуская» — так часта яе называюць самі чыгуначнікі.**

ЗА КУЛІСАМІ «ЧЫГУНАЧНАГА ТЭАТРА»

Нам дазваляюць папрысутнічаць на планёрцы. Непадалёку ад Заслонава — стадыён. Тут, на каменных прыступках, якія нагадваюць старажытнагрэчаскі тэатр, расселіся юныя чыгуначнікі. Маладзёны размяркоўваюць ролі на сёння (дакладна, тэатр!). Нехта хоча папрацаваць у «камандным пункце», нехта — экскурсаводам у вагоне. Вядома, камусьці давядзецца весці лакаматыў. Усяго тут больш за тры дзясяткі чалавек. Прыкладна чвэрць — дзяўчаты.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ»)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
30 08 2012 г.

# САКРЭТЫ ШКОЛЬНЫХ ЗАКУПАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ»)*

І не варта наракаць на адсутнасць густу ў беларускіх вытворцаў. Часам на юных дзелавых лэдзі можна знайсці такую мадэль, што калі былі б падобныя больших памераў, іх не адмовіліся б набываць і дарослыя «офісныя» дамы. Калі не адкладаць закупкі на апошні дзень, можна і на хлопчыка падабраць стыльную і элегантную вопратку. Дарэчы, сёння беларускія вытворцы ствараюць яе з разлікам на рознага пакупніка. Але нават у калекцыях эканом-класа трапляюцца цікавыя мадэлі. Што ўжо казаць пра адзенне VIP-класа. Сучасная школьная форма можа быць зручнай, функцыянальнай і стыльнай.

Калі летась я так і не змагла знайсці ў продажы кашулі на хлопчыкаў з рознымі элементамі апрацоўкі манжэтаў, кішэняў, каўняра, якія могуць быць кантрастных колераў або з вышыўкай, то сёлета натрапіла на іх нават у ажыятажныя жнівеньскія выхадныя. Праўда, і кошт быў адпаведны. Для параўнання, звычайная кашуля на вучня пачатковай школы каштуе сёння 70-90 тысяч, а з цікавым аздабленнем — 178.

**2. ПРЭТЭНЗІІ ДА ВЫТВОРЦАЎ**

Мае спачуванні бацькам, чые дзеці маюць пэўную «нестандартную» фігуру. У час апошніх жнівеньскіх штурмаў крам падабраць і прымераць касцюмчык, напрыклад, на «асаблівага» хлопчыка — сапраўдная праблема. Калі штаны на таліі добра сядзяць, то па даўжыні кароткія, альбо наадварот, калі да пят дастаюць, то з таліі спаўзаюць. Разабраліся са штанамі — высветлілася, што ў пінжаку рукавы кароткія. Сёння, праўда, вытворцамі прымаюцца адпаведныя захады, каб дагадзіць і такім спажыўцам — у продажы ёсць мадэлі з рэгулятарам шырыні штаноў, а на касцюмах можна знайсці два цэннікі: хочаце — купляйце кожную рэч асобна.


Фота БЕЛТА

Адно з найбольш частых нараканняў пакупнікоў датычыцца тканін. Маўляў, адна сінтэтыка і за шалёныя грошы. У той жа час многія бацькі не грэбуюць таксама сінтэтычнымі, але больш таннымі касцюмамі, якія прывозяць, напрыклад, з Украіны. Дарэчы, сёння ў беларускіх крамах можна знайсці дзіцячую дзелавую вопратку з розных тканін. Для яе вытворчасці выкарыстоўваюцца тканіны з воўны і дабаўленнем эластану і шоўку, полівіскозныя тканіны і вельвет, для кашуль — бавоўна як стапрацэнтная, так і з дабаўленнем хімічных валокнаў.

**Асноўнае правіла эканомных бацькоў не ў тым, каб выбіраць для свайго школьніка найбольш танныя канцтавары і амуніцыю, а каб навучыць яго беражліва ставіцца да сваіх рэчаў**

Яшчэ адна праблема, з якой сутыкаюцца бацькі — абутковая. У аддзелах з дзіцячым абуткам мадэлі заканчваюцца за 36-37 памеры. У майго сына 36. Ён ідзе толькі ў трэці клас. Ужо гэтым летам нам было складана знайсці красоўкі на яго нагу, бо асартымент дарослых абутковых секцый для васьмігадовых дзяцей не падыходзіць. Прычым гэтая праблема датычыцца не толькі хлопчыкаў. Не менш складана знайсці абутак (а таксама калготкі) і на дзяўчынак-трэцякласніц.

**3. ДАРАГОЕ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ?**

Напрыканцы лета мы ўсё часцей наракаем на тое, што дзеці — дарагое задавальненне, і часта прывязваем гэта да збораў у школу. Адна справа, калі ваша дзіця ідзе ў першы клас, і вам неабходна закупляць усё. Але ці сапраўды выдаткі на школу кожны год будуць перавальваць за некалькі мільёнаў?

Між іншым, асноўнае правіла эканомных бацькоў не ў тым, каб выбіраць для свайго школьніка найбольш танныя канцтавары і амуніцыю, а каб навучыць яго беражліва ставіцца да сваіх рэчаў. Напрыклад, сёлета мне не трэба было траціцца на пенал, алоўкі, гумкі, нажніцы, пэндзлікі, фарбы, заплечнік. Засталося некалькі сарочак, якія яшчэ не сталі кароткімі. Значыць, мае выдаткі ўжо будуць значна меншымі, чым летась. На дваіх (!) маіх дзяцей малодшага школьнага ўзросту закупка канцтавараў у гэтым годзе абышлася ў 400 тысяч (!). Не разумею тых, хто сцвярджае, што толькі на канцтавары неабходна пусціць каля мільёна. Хаця...

Канцтавары бываюць рознымі. Напрыклад, можна купіць пенал на адно аддзяленне, а можна на тры, фарбы (алоўкі, фламастары) 6-і колераў ці 24-х, прычым выбіраць не папяровую, а металічную ці пластмасавую ўпакоўку. Я паспрабавала параўноўваць кошты на канцтавары ў розных месцах. Калі не шкада часу, на закупцы канцтавараў можна сэканоміць. Напрыклад, фарбы набываць у адной краме, а вокладкі для сшыткаў у іншай. Між іншым, самыя танныя пеналы (20-30 тысяч) я знайшла ў аддзеле спадарожных тавараў крамаў, куды як правіла, па канцтавары ніхто не ходзіць — у прадуктовай краме і магазіне, дзе прадаюцца мыйныя сродкі. У ЦУМе і ГУМе сярэдні кошт на падобныя пеналы — 50-80 тысяч. Для параўнання дадам яшчэ адну лічбу: сёння можна купіць пенал і за 250 тысяч.

Толькі некалькі прыкладаў з разбежкамі ў цэнах: папкі для сшыткаў ёсць як за 6, так і за 57 тысяч, простыя аловак — за 1 і 9 тысяч, вастрылка — за 4 і 40 тысяч, каляровая папера — за 4 і 14 тысяч і г.д. Між іншым, пры набыцці сшыткаў не палянуйцеся адгарнуць вокладку. Часам за яркай вокладкай нават і дарагога сшытка можа быць не вельмі добрая папера. Лепш аддавайце перавагу таварам беларускай вытворчасці — нашы сшыткі, як правіла, зроблены з якаснай паперы.

Заплечнікі сёння каштуюць ад 178 тысяч. Ужо за 250 можна набыць такі, што задаволіць вашага юнага школьніка. А вось ці варта набываць дзецям, якія ходзяць у малодшыя класы, дарагія заплечнікі (коштам яны бываюць і больш за 800 тысяч) — гэта пытанне. Калі вы хвалюецеся за пастаць дзіцяці, не пакідайце без увагі беларускі тавар. Як правіла, нашы заплечнікі лягчэйшыя за замежныя, яны маюць святлоадбівальныя элементы і часам не «перагружаны» лішнімі кішэнькамі. Чым больш кішэняў, тым большая спакуса ў дзіцяці іх нечым запоўніць, і часта рэчамі, не патрэбнымі ў школе.

Вядома, якімі будуць вашы выдаткі, залежыць і ад таго, ці ўлічваеце вы пажаданні дзіцяці. Толькі з-за яркай упакоўкі з папулярнымі героямі мультфільмаў можна пераплаціць некалькі тысяч. Прычым няма гарантыі, што тавар з выявай «чалавека-павука» будзе якасны. Лепш звярніце ўвагу на вытворцу. Напэўна, многія бацькі ўжо ў курсе, што бываюць каляровыя алоўкі (фламастары, васкавыя крэйды), якімі немагчыма маляваць, нажніцы з алюмініевым лязом і гумкі, якія не столькі сціраюць, колькі пэцкаюць. Таму не спяшайцеся рабіць закупкі канцтавараў на рынку, тым больш не заўсёды яны там таннейшыя.

Можна па-рознаму падыходзіць не толькі да выбару тавараў, але і да разліку выдаткаў на школьныя закупкі. Можна ў «кошт першакласніка» закласці не толькі канцтавары, заплечнік, форму, але і абутак (чаравікі каштуюць 200-400 тысяч, красоўкі 300-400), спартыўную форму (200 і вышэй), калготкі на дзяўчат (27-30), некалькі пар шкарпэтак (6-8 тысяч за пару), плату за падручнікі, за дадатковыя працоўныя сшыткі, пісьмовы стол і шафу, дзе дзіця будзе трымаць падручнікі і г.д. А калі яшчэ звярнуць увагу, што абутак і вопратку трэба падбіраць розныя, з улікам сезона, ды яшчэ ўсе гэтыя выдаткі падаць так, быццам мы іх робім у адначассе — нашы дзеці атрымаюцца занадта дарагімі. Але хіба гэта адкрыццё і мы не ведалі пра гэта раней?

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Інтэрбачанне

# РАЗВЕНЧВАННЕ ІЛЮЗІЙ, або Ці чуюць вас у сеціве?

**Ці можа развіццё інтэрнэту пагоршыць сітуацыю з недахопам працоўных рук? Бо маладыя людзі могуць пераарыентавацца на заробкі ў віртуальным свеце. Такая тэма для абмеркавання ўзнікла ў час моладзевага інтэрнэт-форуму «Я — лідар». Аднак эксперты, якія завіталі на гэтае мерапрыемства, каб падзяліцца сваім доследам з маладымі блогерамі, адміністратарамі моладзевых сайтаў і пачаткоўцамі ў вэб-журналістыцы, паспяшаліся запэўніць хлопцаў і дзяўчат, што наўрад ці праца ў інтэрнэце стане масавай. Займацца ёй, і тым больш атрымліваць прыбытак, змогуць не кожны.**

«Лёгкага хлеба ў раскрутцы інтэрнэт-праектаў не бывае. Гэта праца руцінная, карпатлівая, яна патрабуе вялікай канцэнтрацыі, увагі, адпаведных ведаў і прадбачлівасці. Каб нечага дасягнуць, у сеціве трэба жыць. Неабходна ўгадваць трэнды, ведаць, якая інфармацыя можа «стрэліць» сёння, заўтра. Канкурэнцыя ў інтэрнэце будзе расці, і выжываць змогуць толькі самыя «прасунутыя» і таленавітыя», — упэўнены **начальнік упраўлення падрыхтоўкі канцэптуальных дакументаў Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры адміністрацыі Прэзідэнта РБ Аляксей МАЦЭВІЛА.**

Спадзяёмся, думкі, якімі Аляксей Мацэвіла падзяліўся, які некалькі гадоў адпрацаваў з сецівам (у якасці рэдактара сайта, вэб-журналіста і інтэрнэт-аналітыка), будуць цікавыя і нашым чытачам.

**ШМАТГАЛОССЕ**

Зараз не так проста быць заўважаным у інтэрнэце. Самая простая рэч: у многіх карыстальнікаў, якія маюць сёння свае акаўнты ў сацыяльных сетках, больш за 100 сяброў. Калі кожны з сяброў «запосціў» у сярэднім 3-4 паведамленні ў суткі, гэта якога ж памеру атрымаецца стужка навін? Ці магчыма пастаянна ўсё гэта праглядаць і на нечым засяроджваць увагу? Шанцаў, што навіны, якімі вы дзеліцеся, будуць заўважаны і «перапошчаны» далей, вельмі мала. Уявіце вялізную залу, поўную людзей, дзе ўсе размаўляюць адначасова. Ці магчыма разабрацца ў такім шматгалоссі? А інтэрнэт — гэта мільёны галасоў! І, на думку Аляксея Мацэвілы, менавіта незаўважнасць у шматгалоссі — адна з прычын, чаму сёння не варта інтэрнэт разглядаць як барометр грамадскай думкі.

**МАЎКЛІВАЯ БОЛЬШАСЦЬ**

Тым больш што ў інтэрнэце пераважная колькасць карыстальнікаў насамрэч маўклівая, як, дарэчы, і ў рэальным жыцці. Напрыклад: калі ў сеціве абмяркоўвалі пытанні, звязаныя з пакараннем тэрарыстаў, якія ўзарвалі мінскае метро, на разнастайных форумах вяліся гарачыя дыскусіі. Але колькасць тых, хто пакідаў паведамленні, і тых, хто гэтыя форумы ў гэты час праглядаў, рознілася прыкладна ў 20 (!) разоў. Атрымліваецца, толькі адзін з 20 карыстальнікаў выказваў сваю думку. А што думала ў гэты час маўклівая большасць?

**АСТРАТУРФІНГ**

Сёння ў сеціве складана быць пачутым яшчэ і таму, што з'явіўся астратурфінг (англійскае слова Astroturfing азначае штучны газон на стадыёне) — маніпуляванне грамадскай думкай у прамысловым маштабе. Для некаторых людзей фарміраванне грамадскай думкі стала прафесіяй. Так, сёння розныя кампаніі плацяць астратурферам грошы за тое, каб яны пакідалі ў інтэрнэце патрэбныя водгукі. «Маніпулятары» маскіруюцца пад звычайных карыстальнікаў, выходзяць у сеціва пад рознымі «нікамі», наведваюць розныя рэсурсы. Вылічыць іх даволі складана. Праўда, ёсць адна прыкмета: водгукі астратурфераў аднатыпныя, быццам напісаныя пад капірку. Калі раней такія прыёмы выкарыстоўваліся ў асноўным у палітычнай сферы, то зараз астратурфінг з'яўляецца яшчэ і камерцыйным інструментам. Такая з'ява характэрна і для Беларусі, на форумах ужо навязваюцца меркаванні (як станоўчыя, так і адмоўныя) наконт тых ці іншых тавараў і паслуг.

Ужо практычна завершана распрацоўка праграмнага забеспячэння для астратурфінгу, якая дазволіць чалавеку ствараць некалькі дзясяткаў вобразаў у сацыяльных сетках, і не «пустых», як гэта робіцца сёння, а напоўненых інфармацыяй. Такія праграмы дазваляюць ствараць імітацыю рэальнага вобраза, яны прыдумляюць біяграфіі, фотагалерэю.

**ГУЛЬНЯ НА ЎРАЖАННЯХ**

Сёння сусветнае сеціва з'яўляецца падкім на сенсацыі. Прычым даволі рэдка гэтыя сенсацыі носяць пазітыўны характар. Замежныя інфармацыйныя агенцтвы прывілі моду на кур'ёзы, і часам аўтарам вельмі складана прабіцца з больш сур'ёзным прадуктам. Зноў жа разлік ідзе на тое, што ў вялікім патоку інфармацыі шанцаў у матэрыялаў кшталту «жанчына прымерзла да памежнага слупа» значна больш, чым у аналітычнага агляду.

**ПОШУК РАКУРСУ**

Але гэта не азначае, што той, хто нясе пазітыўную інфармацыю, не можа быць пачутым у сеціве. Гэта мастацтва — падаць пазітыўную інфармацыю так, каб яе прачыталі. Аляксей Мацэвіла прыгадаў выпадак: «Калі я працаваў рэдактарам сайта, у нас выйшла інфармацыя: «Мінскі аўтамабільны завод прадаў на пробу ў Германію два аўтобусы для пасажырскіх перавозак». За суткі яна сабрала каля 70 праглядаў. Але калі я памяняў загаловак на «Германія параўнае «МАЗ» з «Мерседэсам», літаральна за некалькі гадзін з'явілася вялікая колькасць праглядаў. Для таго, каб сёння быць заўважаным у інтэрнэце, трэба вучыцца глядзець на факты і знаходзіць патрэбны ракурс для падачы інфармацыі. Інтэрнэт — гэта, найперш, мастацтва загалоўка.

**СЮЖЭТ**

Больш шанцаў звярнуць на сябе ўвагу карыстальнікаў сеціва і ў тых, хто выкарыстоўвае відэа. Але і тут ёсць свае сакрэты. Відэаролікі для інтэрнэту і тэлебачання будуюцца па розных прынцыпах. Працягласць роліку на тэлебачанні — 3-3,5 хвіліны. Па статыстыцы брытанскіх экспертаў, ролік, размешчаны ў інтэрнэце, на 60-й секундзе ў сярэднім працягвае глядзець 40 працэнтаў першапачатковай аўдыторыі. Іншымі словамі, калі вы размясцілі ў сеціве сюжэт больш працяглы, лічыце, што ўся інфармацыя пасля хвіліны — дарэмная праца.

**ПАДМАНУТЫЯ СПАДЗЯВАННІ**

Не трэба мець ілюзій наконт мабілізацыйных рэсурсаў інтэрнэту. Замест рэальных спраў, на якія вы хочаце заклікаць людзей, можаце сутыкнуцца з «мабілізацыяй на канапе» — вам будуць ставіць «лайкі», ухваляць ідэі, «перапошчваць» ваша паведамленне. Але не спадзявайцеся, што знойдзецца шмат тых, хто гатовы нешта зрабіць у рэальным жыцці. Інтэрнэт — гэта не чароўная палачка, а інструмент, якім яшчэ трэба навучыцца карыстацца.

**Падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ДЗІЦЯЧАЯ ЧЫГУНКА: ТАКАЯ ПАТРЭБНАЯ ГУЛЬНЯ Ў РЭАЛЬНАСЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— Гэтыя ролі будуць замацаваныя за імі толькі сёння, — расказвае адзіны дарослы ў гэтай кампаніі, інструктар па арганізацыі руху цягнікоў змены №1 Вольга БЕЛКІНА. — У нас усе за час навучання выконваюць розныя абавязкі.

***— І дзяўчаты таксама могуць машыністамі быць?***

— Безумоўна. Цяжкай фізічнай працы там няма, дык хіба дзяўчына не выканае? Зараз яны запоўняць усе паперы і пойдуць разбірацца па сваіх месцах, каб змяніць папярэднікаў, якія працуюць з раніцы. Увогуле, у нас займаецца больш як 500 дзяцей. Мы нікога не трымаем, калі адпачыць трэба — даём. Ніхто і не гультайнічае, бо менавіта праца з цягніком для большасці і з'яўляецца самай цікавай.

***— А што іх чакае далей? Ці лёгка зрабіць з такога хобі прафесію?***

— Вядома, у нашых вучняў прыярытэт перад іншымі пры паступленні ў чыгуначны каледж. Самым лепшым мы выдаём накіраванні на вучобу, яны праходзяць па-за конкурсам. Адзінае, што ім трэба «здаць» — медкамісія. Ёсць, праўда, і такія, хто прыходзіць пазаймацца адзін год, каб атрымаць гэтае самае накіраванне. Але такія хітрыкі тут не праходзяць. Ёсць шанц толькі тады, калі ты сапраўды паспяваеш авалодаць усімі ведамі, якія маюць астатнія. Ёсць у нашых хлопцаў і дзяўчат іншыя льготы: яны, напрыклад, маюць права бясплатна карыстацца электрычкамі на «вялікай» чыгунцы.

...Дарослых супрацоўнікаў тут усяго 13. Прычым у сам працэс яны не ўмешваюцца, а збольшага назіраюць, каб не было памылак і экстранных сітуацый.

Падчас змены «брыгад» на платформе збіраецца натоўп з навучэнцаў. У кожнага, акрамя формы, ёсць бэйдж, таму хутка з усімі знаёмімся.

***— Як ты трапіў на дзіцячую чыгунку?*** — пытаемся ў аднаго з навучэнцаў, Кірыла МАЛАКОВІЧА.

— Прыйшоў сам. Звычайна ўсіх запрашаюць праз школы, а я з дзяцінства прыходзіў сюды катацца, а потым пачаў займацца. Вось ужо год, як я тут. Ніяк не шкадую, што праводжу тут свае выхадныя — мне вельмі падабаецца. Хаця пакуль быць машыністам не магу — рана. Таму звычайна працую праваднiком.

***— Не плануеш звязаць сваю будучыню з чыгункай?***

— Планую, толькі не з «вялікай». Хачу быць машыністам у метро. Мы ходзім на экскурсіі, звязаныя з чыгункай. Былі і ў мінскай «падземцы». Пасля гэтага загарэўся. Падабаюцца цёмныя тунэлі і хуткасць.

## НА ТОЙ ЖА СТАНЦЫІ СЫДУ...

Наш цягнік адпраўляецца ў 13:22. Першы круг вырашаем праехаць у кабіне. У лакаматыве увесь час працуюць тры чалавекі: машыніст, яго памочнік і інструктар. З апошнім мы і знаёмімся. Аляксандр КІРЫЛЬЧЫК здаецца ідэальным чалавекам на пасаду інструктара дзіцячай чыгункі: усю дарогу засыпае нас жартамі і прафесійнымі анекдотамі, размаўляць з ім можна, здаецца, бясконца.

— Падказваць даводзіцца толькі першых паўмесяца, — расказвае Аляксандр Аляксандравіч. — Потым я ў гэтую справу не лезу. Сам працую машыністам на «вялікай» чыгунцы, а сюды мяне накіроўваюць быццам бы на адпачынак *(смяецца)*. З дзецьмі працаваць прыемна, і я сапраўды адпачываю. Бывае, праўда, даводзіцца і строгім пабыць. Некаторыя вось занадта разганяюць цягнік, хоць максімальная дазволеная хуткасць — 20 кіламетраў у гадзіну. Даводзіцца іх спыняць. А ўвогуле, дзеці вельмі добрыя. Гатовы тут днямі і начамі сядзець. Бывае, прыходзяць, не абедаючы, і так тут да вечара і застаюцца.

Цягнік хутка рухаецца наперад. З рацыі дзіцячым яшчэ голасам даносяцца каманды машыністу. «610-ы, слухаю!» — праз грукат колаў адказвае наш машыніст. А мы тым часам размаўляем з яго памочнікам.

— Праца ў мяне не цяжкая, — кажа Косця ХАРУК, — часам прыходзіцца амаль увесь дзень адпрацаваць, але я не стамляюся. Прыйшоў сюды мэтанакіравана, хачу працаваць памочнікам машыніста электравоза. Два гады пазаймаўся — і вось ужо я памочнік, толькі чыгунка «маленькая».

...Тым часам цягнік развярнуўся на станцыі Сасновы Бор і пайшоў назад, на Заслонава. За гэты час мы перасаджваемся ў вагон і назад едзем ужо ў якасці пасажыраў.

Пасля паездкі ў кабіне тут занадта ціха і спакойна. З калонак граюць знаёмыя з мультфільмаў савецкага часу песні, вагон упрыгожаны малюнкамі, на вокнах — фіранкі. Адразу ж можна намаляваць вобраз сярэднестатыстычных пасажыраў дзіцячай чыгункі: адзін ці два дарослыя (адзін абавязкова з фотаапаратам), разам з імі дзіця. Малыя не сумуюць: за акном павольна праплываюць пейзажы гарадскога жыцця, лес. Бацькі таксама весяляцца, магчыма, не менш за дзятву. Ёсць, дарэчы, і выключна дарослыя кампаніі. У самым канцы вагона заняла месца кампанія падлеткаў, якіх, відавочна, у вольны час прывабіў гэты маленькі цягнік.

...На Заслонава вяртаемся праз 35 хвілін. Падумалася, што гэта, напэўна, адзіны цягнік, які прыбывае на станцыю свайго ж адпраўлення. Можа, таму пасля паездкі не сумуеш — выйшаў там жа, дзе і зайшоў.

## «МЫ — ДЛЯ ПАСАЖЫРАЎ, А ЯНЫ — ДЛЯ НАС»

Апошні наш візіт — у кабінет начальніка дзіцячай чыгункі Валерыя САВІЧА. Размову пачынаю з прозвішча свайго знаёмага, які скончыў тут займацца чатыры гады таму.

— Завуць Андрэем, здаецца? Так, памятаю, — здзіўляе мяне Валерый Віктаравіч.

***— Як вы лічыце, ці не страціла сваёй актуальнасці дзіцячая чыгунка? Усё ж такі час змяняецца, змяняюцца дзеці...***

— Нават рэчы, якія страчваюць сваю актуальнасць, вартыя таго, каб імі захапляцца. А пра страту актуальнасці нашай чыгункай размовы не ідзе ўвогуле: яна патрэбна, прычым вельмі. Сёння дзеці часта страчваюць пачуццё рэальнасці, вось гэта праблема. А тут мы прапануем ім гульню, але гульню ў рэальнасці. Многія нават сёння ў добрым сэнсе гэтага слова «хварэюць» чыгункай. А мы даём дзецям шанц пазнаёміцца з чыгункай максімальна блізка, зразумець, як яна працуе. Даём шанц самарэалізавацца, нарэшце. Акрамя таго, тут рыхтуюцца кадры для «вялікай» чыгункі. Хто ведае, магчыма нехта з іх праз колькі гадоў стане міністрам транспарту *(смяецца)*.

***— Складана працаваць з дзецьмі людзям без адукацыі педагога?***

— Вельмі лёгка. Тут амаль усе дарослыя супрацоўнікі з тэхнічнай адукацыяй. Аднак падыход да дзяцей находзяць без праблем. Увогуле, дзіцячая чыгунка задумвалася як тэхнічны гурток. Такой яна ёсць па сваёй сутнасці і цяпер. Асобны момант — наяўнасць пасажыраў. Але для гэтай чыгункі пасажыры — не мэта, а «працоўны матэрыял». Мы працуем з пасажырамі і для пасажыраў. Аднак вельмі крыўдна, калі нас называюць атракцыёнам. Гэта не так.

***— І ўсё ж такі, для каго існуе малая чыгунка: для навучэнцаў ці для пасажыраў?***

— Я думаю, у нас атрымаўся ідэальны сімбіёз. Без пасажыраў не будзе сапраўднай чыгункі, і наадварот. Тым больш, я думаю, існуе своеасаблівая рамантыка чыгункі: перастук колаў, гэткая стальная рапсодыя... Менавіта яна цягне сюды як пасажыраў, так і дзяцей.

***— Мы ўбачылі, што пасажыраў вельмі шмат. Ці акупляецца сёння дзіцячая чыгунка?***

— Я думаю, складана сёння знайсці дзіцячы гурток, які б акупляўся. Тым больш што вучацца дзеці абсалютна бясплатна. За заняткі мы грошай не бяром, як і за форму. Усё выдаецца проста так. Таму ўсе выдаткі мы не пакрываем, знаходзімся на забеспячэнні Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі. Хоць пасажыраў сапраўды шмат, і мне радасна, што колькасць іх не падае.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**


Фота Настассі ХРАЛОВІЧ.

**«МЫ даём дзецям шанц пазнаёміцца з чыгункай максімальна блізка, зразумець, як яна працуе. Даём шанц самарэалізавацца, нарэшце. Акрамя таго, тут рыхтуюцца кадры для «вялікай» чыгункі. Хто ведае, магчыма нехта з іх праз колькі гадоў стане міністрам транспарту».**

*Студэнт шукае жыллё*

# НЕ ПА КІШЭНІ...

**Ура, я ўжо студэнтка! Акрамя таго, я змагла стаць студэнткай бюджэтнай формы навучання. Дарэчы, адукацыя ў многіх ВНУ каштуе больш за 10 мільёнаў беларускіх рублёў — наўрад ці мае бацькі з заробкамі невялікага правінцыйнага горада змаглі б выцягнуць такія выдаткі, тым больш што яшчэ патрэбны грошы і на жыллё.**



У маёй ВНУ інтэрнат атрымліваюць студэнты, якія маюць ільготы, або тыя, хто ўключаны ў банк звестак таленавітай і адоранай моладзі. Для студэнтаў агульнай чаргі месцаў звычайна не хапае. Яны вымушаны шукаць жыллё самі: здымаць пакой ці кватэру. Менавіта гэтым я і занялася адразу пасля паступлення.

Спачатку я спрабавала знайсці кватэру праз інтэрнэт. Варта было зірнуць на некалькі першых аб'яваk, каб адчуць, што паступіла «ў сталіцу»: цэны на аднапакаёвыя кватэры — ад 180 да 350 долараў за месяц! Некалькі тыдняў спрабавала знайсці больш танныя варыянты. Але калі пераглядзела шэраг сайтаў, усё роўна нічога менш за 180 долараў не знайшла. Змірыўшыся з непазбежным, пачала тэлефанаваць па адрасах. Але колькі ні званіла, усе адказвалі, што ўжо здалі кватэру. Мяне ахапіла паніка. Але мама сказала, што хвалявацца яшчэ рана, будзем звяртацца ў агенцтва.

Агент за свае паслугі папрасіў 500 тысяч, але папярэдзіў, што «кватэру ў Мінску на гэты момант зняць амаль нерэальна», і ён можа прапанаваць толькі некалькі варыянтаў пакояў. Выбару ў мяне не заставалася, таму на наступны дзень я са сваёй сяброўкай Аленай, з якой збіралася здымаць кватэру, паехала ў сталіцу глядзець жыллё. З раніцы пачалі хадзіць па прапанаваных агентам адрасах. Гэта было нялёгка, бо мы зусім не ведаем горада. З горам папалам знаходзілі дамы, глядзелі пакоі. Але ў выніку так нічога і не знайшлі. Адна кватэра была на ўскраіне горада, і дабірацца да інстытута трэба было б больш за гадзіну. Другая была ў самым цэнтры, але каштавала 100 долараў з чалавека. Трэцяя знаходзілася ў жахлівым стане. Гаспадаром чацвёртай быў малады мужчына, таму нам з сяброўкай не падышоў гэты варыянт. У пятай сказалі: калі мы будзем жыць у іх, нам зробяць пэўны расклад дня (выходзіць з дому не раней за 7 гадзін раніцы, прыходзіць не пазней за 7 вечара). Гэты варыянт нам таксама не спадабаўся , і мы з Аленай, расчараваныя і стомленыя, паехалі дадому. Думалі, што застанемся зусім без жылля. І мусіць, так і было б, каб не дапамога сваякоў, якія нарэшце праз сваіх знаёмых знайшлі нам цудоўны пакой за невялікую плату і недалёка ад цэнтра.

А ці складана знайсці жыллё ў іншых буйных гарадах нашай краіны? Зноў звярнулася да інтэрнэту: вырашыла паглядзець цэны на жыллё ў Гродне. Зняць аднапакаёвую кватэру ў гэтым горадзе каштуе ад 100 да 200 долараў у месяц. Як бачыце, розніца ў цэнах на жыллё паміж сталіцай і абласным цэнтрам істотная.

«Жыллё ў Гродне я знайшла хутка, — расказала мая аднакласніца, якая паступіла ў Гродзенскі каледж мастацтваў. — Патэлефанавала па першай жа аб'яўцы. Разам з дзвюма дзяўчынкамі буду жыць у двухпакаёвым, і кожная будзе плаціць па 50 долараў».

Атрымліваецца, што «сталічная» адукацыя не ўсім па кішэні. У тым ліку і з-за высокіх цэн на жыллё. А калі кошт і надалей будзе расці, ці будзе даступнай для ўсіх не тое што платная, а нават «бясплатная» адукацыя? Трэба вырашаць гэтае пытанне: будаваць больш інтэрнатаў, ствараць хостэлы, якім-небудзь чынам рэгуляваць цэны на жыллё для студэнтаў.

Ну і апошняе. Перад тым, як паступаць у ВНУ і СНУ Мінска, трэба рэальна ацаніць матэрыяльныя здольнасці сваіх бацькоў. Ці атрымаецца ў іх без самаахвяравання вучыць нас у сталіцы? Можа, у мэтах эканоміі (прынамсі, на арэндзе жылля) ёсць сэнс разгледзець варыянты з паступленнем і ў іншыя гарады нашай краіны? Як той казаў: і козы сытыя, і сена цэлае.

**Марына ЖАБІК.**

Нашэшэнь :)

# ПАМІЖ НАМІ, ДЗЯЎЧАТАМІ

## Нявінныя забавы

Не так даўно ў Маскве з'явілася дзіўнае грамадскае аб'яднанне — клуб нявінніц імя Гогаля. Як распавядае цікаўным кіраўніца суполкі, 62-гадовая Арына Мікалаеўна, на мэце клуб мае падрыхтоўку дзяўчат да вяселля. Дзеля гэтага ўдзельніц — а ім, паводле апошняга «перапісу», ад 17 да 43 гадоў — навучаюць кулінарыі і ўменню шыць, выкладаюць псіхалогію і асновы вядзення хатняй гаспадаркі.

Асноўная (яна ж адзіная) умова для законнага знаходжання ў суполцы — захаванне нявіннасці да вяселля. Пытанне, між іншым, трымаецца на строгім кантролі і кожныя 5 месяцаў правяраецца ўрачамі-гінеколагамі.

«Шлюбным узростам» тут лічыцца 26 гадоў. Прычым кандыдатам у жаніхі «клубных» паненак таксама жыццё мёдам не здаецца: знаёмства з патэнцыйнымі нявестамі адбываецца толькі пасля таго, як жаніх атрымае адабрэнне ўсіх (!) жанчын-удзельніц клуба.

Падумаеш, скажа нехта, няхай сабе нявінніцы ўсёй Расіі аб'ядноўваюцца па інтарэсах — неблагую ж справу робяць. Ахвотныя нават могуць дапамагчы — ахвяраваць на банкаўскі рахунак клуба колькі грошай у падтрымку расійскіх нявінніц. І ўсё ж хвалююць (мяне) два пытанні: ці выдаецца пасля заканчэння вучобы нявестам нейкі сертыфікат (у прыватнасці, «да шлюбу прыдатная») і, галоўнае, пры чым тут Гогаль?

## Курыца не птушка, а нагода для скандалу

Сусветна вядомую калумбійскую спявачку Шакіру прыцягнулі да суда за нявыплаты кампенсацыі пры звальненні шафёра і кухаркі. Сума іску складае крыху больш як 200 тысяч долараў.

І ў гэтым не было б нічога дзіўнага, калі не ўлічваць некалькі акалічнасцяў. Цяперашнія ворагі артысткі Дзіўер Эрнандэс і яго жонка Марыца Марцінес працавалі ў сям'і Шакіры больш за 10 гадоў і пераехалі следам за ёй спачатку ў Маямі, а потым у Каталонію. Сварка ж паміж імі і гаспадыняй, як сведчыць тэкст іску ажно на 7 старонках, адбылася яшчэ ў маі гэтага года з-за... смажанай курыцы. Спявачка, вярнуўшыся з сябрамі апоўначы дадому, нібыта папрасіла памочнікаў па гаспадарцы прыгатаваць ёй вышэйназваную страву, але тыя адмовіліся з-за страшэннай стомленасці. Пасля чаго, уласна, як быццам і разгарэўся скандал з крыкам, абвінавачваннямі, выгнаннем шафёра і кухаркі і начлегам апошніх на лавачцы ў парку.

Далей, па сцвярджэнні абаронцаў істцоў, пачаўся сапраўдны дэтэктыў: былым служачым спачатку прадстаўнікі артысткі прапанавалі кампенсацыю ў 6 тысяч долараў, а потым невядомыя дасылалі на электронную пошту лісты з пагрозамі... За перажыты стрэс, а таксама нявыплачаныя падчас працы прэміі, адпускныя і ўнёскі ў сістэму сацыяльнага страхавання пакрыўджаны бок патрабуе названую суму — больш за 200 тысяч долараў. Адвакаты Шакіры Ісабель Мебарак Рыполь, у сваю чаргу, намякаюць, што экс-памочнікі маюць намер шантажыраваць спявачку, а таму грошай не атрымаюць.

Пачыналася ж усё, нагадаю, з няшчаснай смажанай курыцы, якая абяцае стаць для не ў час згаладалай Шакіры сапраўды залатой. А выконвала б поп-знакамітасць правіла «не есці пасля шасці», глядзіш, не абсмоктвалі б цяпер яе ўласныя косткі ў жоўтай прэсе.

## Я стамілася, я сыходжу

Двухразовая алімпійская чэмпіёнка, немка Магдалена Нойнер афіцыйна развіталася з дзяржслужбай — а працавала сімпатычная бландзінка не дзе-небудзь, а на мытні.

Улічваючы, што мытная служба Германіі аказвала Нойнер, а таксама 4 дзясяткам іншых прафесійных спартсменаў, фінансавую падтрымку падчас спаборніцтваў (а сёлета дзяўчына завяршыла спартыўную кар'еру), такі крок выглядае цалкам лагічным. Дый сама Магдалена не выказала асаблівага суму з нагоды сыходу са службы: «Безумоўна, мне крыху шкада, але рана ці позна ўсё завяршаецца і пачынаецца нешта новае», — па-філасофску разважала Нойнер, атрымліваючы ад ужо былых калег памятны падарунак і кветкі.

А вось каго дакладна ўзрадавала такая навіна, — гэта патэнцыйных кантрабандыстаў: ад 12-разовай чэмпіёнкі свету па біятлоне, калі што, далёка не збяжыш... Зрэшты, прыхільнікі спартсменкі ўсё яшчэ спадзяюцца, што іхае сямейнае жыццё надакучыць Лене і яна так ці інакш вернецца ў шэрагі элітных стралаючых лыжнікаў.

## Алё, мы шукаем... Мурзілку?

Тэлеканал АНТ шукае 40 беларусак для ўдзелу ў новым тэлевізійным праекце — «Лэдзі-Х». Прычым, як сцвярджае афіцыйны рэліз, гаворка ідзе не пра чарговы конкурс прыгажосці, а пра «арыгінальнае шоу для амбіцыйных, таленавітых, інтэлектуальных і ўпэўненых у сабе дзяўчат».

Зробім выгляд, што паверылі, і пазнаёмімся бліжэй з умовамі адбору і анкетай для суіскальніц. Бачым: да ўдзелу дапускаюцца незамужнія дзяўчаты ва ўзросце 18-28 гадоў (верхняя планка конкурсаў прыгажосці, як правіла, 25 гадоў), з яркай знешнасцю, «высокім інтэлектам і адметнымі талентамі». Пытанне пра абхват грудзей, таліі і сцёгнаў у анкеце стаіць адным з першых — гэта так, для паўнаты карціны. Але большасць з амаль паўсотні пытанняў — сапраўдны іспыт на інтэлект і нестандартнасць удзельніц. «Хто забіў Кені? Хто забіў Кензэдзі? Што такое афсайд? Лепшы сродак ад пахмелля? Хто з чарапашак ніндзя вам падабаецца найбольш і чаму? Як прапатчыць KDE2 пад FreeBSD? Што б вы паралі крату з мультфільма пра крата? Якія песні вы спяваеце ў душы?» — пасля гэткага допыту складаецца ўражанне, што арганізатары шоу шукаюць не дзяўчыну, а памочніка рэдактара гуманітарыстычнага часопіса «Мурзілка». Зрэшты, крыху праясняе справу той факт, што вядучым новага праекта стане Вадзім Галыгін, вядомы сваім вострым языком і рызыкоўнымі жартамі. Дый галоўны прыз — рамантычная паездка ў Францыю — пэўна, варты ўсіх нечаканых «і ў чымсьці нават каварных» выпрабаванняў, якія рыхтуюць удзельніцам арганізатары. Ужо напрыканцы верасня стане вядома, хто гатовы ўразіць суддзяў і публіку «сваім усім» (гл. другі абзац). А публіка, як заўжды, падзеліцца на лагеры: адны будуць глядзець «Лэдзі-Х», як новы серыял, другія — пляваца ядам, трэція — ганьбіць другіх (я ўжо прадбачу каментары ў сацыяльных сетках: «Дык вы проста зайздросціце!»), і ўсе разам — выбіраць чарговую беларускую супердзяўчыну. Удачы нам усім у гэтай нялёгкай справе!

**Дзяжурыла па сецціве Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Прадаўжальнік традыцый

# КАЛІ ДУША ХВАРЭЭ ЗА БЕЛАРУСЬ...

**Алесь Галкоўскі — чалавек з незвычайным па сучасных мерках светапоглядам. У сваё няпоўныя 22 гады ён ведае пра беларускія народныя строі больш за некаторых сваіх выкладчыкаў з універсітэта, вывучае гісторыю і культуру Беларусі і можа бясконца пра іх распавядаць. Ды так, што будзеш слухаць з шырока расплюшчанымі вачыма. А яшчэ Алесь жыве ў вёсцы і нараўне з бацькам падтрымлівае вялікую гаспадарку.**



**Яшчэ адно старадаўняе рамяство, якім валодаюць у нашай сям'і, гэта шапавальства. Мы трымаем статак авечак, таму ўся вытворчасць валёнкаў у нас наладжана ад «А» да «Я». Таксама пляцём кашы, лапці. Пчалярствам займаемся, але зараз гэта не рэдкасць.**

## УСЁ ІДЗЕ З СЯМ'І

*Хлопец кажа, што не хацеў бы жыць у вялікім горадзе і шкадуе, што моладзь з'язджае з вёскі, забываецца на свае традыцыі. Я пацікавілася, чым абумоўлена такое дзіўнае для маладога беларуса меркаванне.*

— Гэта звыклае для мяне асяроддзе. Я нарадзіўся і жыву ў такой сям'і, у якой заўсёды было шмат аўтэнтычных прадметаў народнага побыту (бацька Алеся Аляксандр Галкоўскі — вядомы краязнаўца ў Клімавіцкім раёне. — **Аўт.**). Мы заўсёды збіралі і імкнуліся зберагчы гэтыя рэчы...

## НА ЎСЕ РУКІ МАЙСТАР

*Алесева сям'я не толькі збірае старажытныя прадметы побыту. Шматлікімі прыладамі Галкоўскія карыстаюцца пры рамесніцтве. Алесь, вядома, таксама валодае тэхналогіямі некаторых народных рамёстваў.*

— Мой бацька аднойчы знайшоў уцалелы фрагмент старадаўняга пояса. Ён запомніў узор і праз некаторы час аднавіў тэхналогію ткацтва гэтых паясоў. Нас, сваіх хатніх, таксама навучыў ткаць. Яшчэ адно старадаўняе рамяство, якім валодаюць у нашай сям'і, гэта шапавальства. Мы трымаем статак авечак, таму ўся вытворчасць валёнкаў у нас наладжана ад «А» да «Я». Таксама пляцём кашы, лапці. Пчалярствам займаемся, але зараз гэта не рэдкасць.

## «У НАС СТО-О-О-ЛЬ-КІ ЎСЯГО...»

Мая спецыяльнасць — музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. — **Аўт.**). Яна вучыць арыентавацца ў гісторыка-культурных каштоўнасцях, мы шмат ездзім з экскурсіямі ад універсітэта. Большасць беларусаў цяпер не ведае, колькі ўсяго ёсць у Беларусі, думаюць, што ў нас няма на што паглядзець. На маю думку, так можа казаць толькі той чалавек, які не ездзіў па краіне. *(Узрушана.)* Бо як пачынаеш ездзіць па вёсках і мястэчках, у кожным з іх знаходзіш свае таямніцы. Акрамя фальклору, архітэктуры, матэрыяльнай спадчыны, у такіх паездках знаёмішся з людзьмі, на ўласным вопыце вывучаеш беларускі менталітэт. Настолькі шмат у нас жыве цікавых людзей, пра якіх проста бяры і кніжкі пішы, — не пераказаць!..

Аднойчы мы з сястрой збіралі прымаўкі нашага раёна (Клімавіцкага. — **Аўт.**). Сабралі больш за 1200 прымавак. Ездзілі па вёсках і проста размаўлялі з людзьмі. Гутарыш з якой-небудзь бабулькай, і раптам падчас гутаркі праскочыць нейкі выраз цікавы! Аказваецца — прымаўка, ты яе запісваеш. Так і збіралі. Безумоўна, толькі сваім раёнам не абмяжоўваемся, але ў нас сто-о-о-ль-кі ўсяго назбіралася, што нават гэта не хапае часу вывучыць.

## У ВІРЫ ІДЭЙ І ПРАЕКТАЎ

*У справе захавання культурнай спадчыны Алесь не абмяжоўваецца гатовымі рэчамі. Ён стварае і свае праекты.*

— У мяне ёсць ідэя стварэння ілюстраванага слоўніка дыялекту нашай мясцовасці. Успамінаю альбо чую нейкае цікавае слова, занатоўваю яго, даю адпаведнік з літаратурнай мовы і яшчэ пішу рускамоўны пераклад. Калі прадметы не зніклі з ужытку, раблю іх фотаздымкі. Планую потым падключыць прафесіяналаў і выдаць кніжку.

Хацелася б разнастаіць культурнае жыццё ў Магілёве, куды я хачу трапіць на працу ў музей пасля вучобы. У Мінску цяпер ладзяць шмат мерапрыемстваў гісторыка-культурнага характару — напрыклад, старабеларускія танцы. Было б цудоўна арганізаваць нешта падобнае ў Магілёве. Увогуле, музейшчыкам трэба быць крэатыўнымі людзьмі, прыдумляць розныя «фішкі», каб наведвальнікам было цікава. На гэты конт у мяне таксама ёсць пэўныя задумы.

## «ПАДРЫХТАВАЛІ ВЫСТАВУ ЗА ДЗЕНЬ»

*Дарэчы, у Алесевай скарбонцы ўжо ёсць некаторыя ідэі і праекты, якія ўдалося ажыццявіць.*

— Калі я быў на практыцы гэтай вясной, удалося цалкам зладзіць выставу ў магілёўскім Музеі этнаграфіі. Адзін калекцыянер з Віцебска прывёз збор калекцыйна-сувенірнай агнястрэльнай зброі XVII — XIX стагоддзяў, каб выставіць яго падчас «Ночы музеяў». Каб зрабіць выставу, патрабуецца два тыдні адзін толькі мантаж рабіць. А яшчэ трэба было падрыхтаваць анатацыі і экскурсію. Але зброю прывезлі ў аўторак, а ў пятніцу яе трэба было ўжо выстаўляць. У выніку выстава цалкам была падрыхтавана амаль за адзін дзень. Пасля гэтай «Ночы музеяў» я быў ледзь жывы фізічна, але эмацыянальна вельмі ўзрушаны. Толькі на пятым курсе нам будуць чытаць лекцыі па арганізацыі такіх выстаў, але супрацоўнікі музея і гледачы засталіся задаволеныя.

*Калі сустракаеш людзей, якія ў добрым сэнсе душой хварэюць за Беларусь, разумееш, што нашая традыцыйная культура не страчана. Дзякуючы такім людзям яна будзе жыць.*

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота з асабістага архіва Алеся ГАЛКОЎСКАГА.**

Асобы



Фота Надзеі БУЖАН.

Карына ЁЖЫКАВА:

# «КАЛІ МЯНЕ МОЦНА ЗАЧАПІЦЬ, МАГУ І ЎКАЛОЦЬ»

**ЯНА гуляе за самы вядомы гандбольны клуб краіны, а падчас апошняга чэмпіянату Беларусі была прызнана лепшым бамбардзірам. У сваe 22 гады спартсменка паспела пагуляць за Расію, сысці з вялікага спорту, зноў вярнуцца... і зайграць яшчэ лепш. Менавіта гэтай гандбалістцы прадказваюць хуткае лідарства ў нацыянальнай жаночай зборнай. Як не апусціць рукі, калі ўрачы ставяць крыж на спартыўнай кар'еры? Чаму балалайка не вельмі адрозніваецца ад гітары і ў чым праблемы айчыннага гандбола? Пра гэта «Чырвонцы» распавяла гулец клуба «БНТУ-БелАЗ» Карына ЁЖЫКАВА.**

**— Раскажы, калі ласка, як ты трапіла ў гандбол?**

— У мяне вельмі спартыўная сям'я: мама — былая гандбалістка, цётка займаецца трэнерскай дзейнасцю ў Германіі, тата гуляе ў баскетбол у аматарскай лізе. Спачатку я шэсць гадоў займалася вялікім тэнісам. У пэўным узросце нават была першай ракеткай Магілёўскай вобласці. Але потым вынікі пайшлі на спад. Бацькі сумленна растлумачылі, што ў будучыні перспектыў у мяне няма. Вось я і вырашыла пераключыцца на гандбол. І не прагадала! Напэўна, гэта мой від спорту на генетычным узроўні. Ужо на першай трэніроўцы я забіла некалькі галоў. Хаця дзяўчынкі, з якімі я спаборнічала, займаліся гандболам некалькі месяцаў, а я толькі ўзяла ў рукі мяч. Увечары ў эйфарыі прыйшла дадому і сказала бацькам, што гандбол — гэта маё.

Потым з роднага Бабруйска перабралася ў Мінск, паступіла ў вучылішча алімпійскага рэзерву. Усё было добра, але тут мае поспехі ніхто не заўважаў. А вось расійскія трэнеры мною зацікавіліся і запрасілі да сябе.

**— Як атрымалася, што ты вярнулася ў Мінск?**

— У 2009 годзе ў мяне выявілі праблемы з сэрцам. Расійскія ўрачы адразу вынеслі вердыкт: на гэтым са спортам скончана. Безумоўна, для мяне гэта быў шок. У 19 гадоў у многіх толькі пачынаецца спартыўная кар'ера, а на мне ўжо паставілі крыж. Ды і што рабіць, калі ты ўсё юнацтва прысвяціў гандболу і, па сутнасці, нічога іншага не ўмееш? Прыйшлося вучыцца жыць без любімай гульні. Я засталася ў Валгаградзе, пачала займацца вучобай, некаторы час працавала. Насамрэч, думала, што больш не вазьму ў рукі мяч. Але потым стан здароўя стаў паляпшацца, і з'явіліся думкі пачаць нанава. Тым больш — бацькі мяне вельмі падтрымлівалі, асабліва тата прасіў, каб не здавалася.

Заставацца ў Расіі не было сэнсу. Там ніхто не будзе рызыкаваць і браць у каманду спартсмена, які некалі меў праблемы са здароўем. Нават калі зараз у цябе абсалютна «чыстая» медыцынская карта. Тады дапамагла мама. Яна папрасіла галоўнага трэнера БНТУ-БелАЗ узяць мяне ў каманду, і Канстанцін Рыгоравіч Шаравараў узяў на сябе адказнасць, даў мне шанц, за што яму вялікі дзякуй.

**— Па правілах, пасля вяртання ў Беларусь ты тры гады не мела права выступаць за зборную. Вось-вось скончыцца «каранцін», і ты нарэшце зможаш сыграць за краіну. Чакаеш гэтага моманту?**

— Несумненна. Шчыра кажучы, мне здавалася, што гэты тэрмін ніколі не закончыцца, але тры гады праляцелі вельмі хутка. Разумею, што новы сезон будзе асаблівым для мяне. Раней я ніколі не праводзіла афіцыйныя матчы за родную зборную, і мне вельмі хочацца паспрабаваць сябе на новым узроўні.

**— Які настрой на кваліфікацыйныя матчы чэмпіянату свету-2013?**

— Самы баявы. Я лічу, што нам пашанцавала з сапернікамі, і гэтым трэба скарыстацца. Асноўным канкурэнтам будзе зборная Польшчы. Думаю, нас чакаюць цікавыя і складаныя матчы з суседкамі. Каманды Італіі і Літвы крыху слабейшыя, але і з імі будзем змагацца на максімуме. Я не раз казала, што галоўнае — паверыць у сябе. Прыгадваю леташнія кваліфікацыйныя матчы чэмпіянату Еўропы. У вырашальнай сустрэчы з венгеркамі нашы дзяўчаты вялі ў ліку, але не дайгралі ў канцоўцы. Чаму саступілі? Напэўна не паверылі, што змогуць абыграць «топавую» каманду. Такога быць не павінна. Таму хочацца пажадаць сабе, гульцам зборнай, чэмпіянату, ды і ўсім спартсменам заўсёды верыць да апошняга, што ўсё магчыма, і ніколі не прымяншаць сваіх шанцаў на перамогу.

**— Ты вядзеш блог на сайце газеты «Спартыўная панарама». Раскажы, калі ласка, пра гэты вопыт.**

— Адзін з супрацоўнікаў выдання прапанаваў такую ідэю. Я доўга думала. На той момант на сайце свой блог вяла гімнастка Любоў Чаркашына. Я сачыла за яе запісамі, глядзела, пра што ўвогуле пішацца ў спартыўных дзённіках. Шчыра скажу, да апошняга сумнявалася, думала, што не змагу знаходзіць не пустыя, а актуальныя тэмы для разважанняў. Але па парадзе маці вырашыла ўсё ж такі паспрабаваць. Па першых публікацыях зразумела, што ёсць пэўны поспех. Людзі чытаюць, пакідаюць каментарыі, задаюць пытанні, просяць расказаць пра канкрэтныя рэчы. А калі водгук ёсць, працягваць пісаць далей вельмі прыемна.

**— У адным з запісаў ты ўзняла тэму недастатковага фінансавання гандбола. На твой погляд, праблема дасягнула крытычнай адзнакі?**

— Не, канца свету дакладна не прадбачыцца *(смяецца)*. Я разумею, што наш від спорту ніколі не зраўняецца па папулярнасці з футболам ці хакеем і, адпаведна, не будзе фінансавацца ў такіх жа памерах. І гэта натуральна, бо такі расклад не толькі ў нас, але амаль ва ўсім свеце. Аднак нічога не рабіць для развіцця гандбола ў нашай краіне таксама няправільна. Лепшае выйсце — працягваць укладваць сродкі ў дзіцячую школу. Паглядзіце на нядаўні поспех нашых юнакоў 1994 года нараджэння, якія вельмі добра сыгралі на чэмпіянаце Еўропы. Так, гэта вельмі нялёгкі і доўгі шлях, але па-іншаму сітуацыю ніяк не змяніць. Можна набываць вядомых гульцоў у клубы, але легіянеры рана ці позна сыдуць, і з чым мы застанемся?

**— Ці можна спадзявацца, што настане той час, калі гандбол у нашай краіне будзе збіраць сапраўдныя палкі балельшчыкаў?**

— Я шчыра веру, што так і будзе. Многае залежыць ад нас, спартсменаў. Будзем паказваць годныя вынікі — цікавасць да гандбола абавязкова з'явіцца. Маленькімі крокамі, але мы паступова ідзём да гэтага. Узяць хоць бы поспех нашай мужчынскай зборнай, якая ўпершыню за 17 гадоў здабыла пуцёўкі на чэмпіянат свету. Вы б бачылі, колькі аматараў спорту сабралі нашы хлопцы на «Мінск-Арэне» ў вырашальным матчы са славакамі! Гэта было сапраўднае свята.

**— Давай пагаворым пра цябе. Твае паклоннікі ў каментарыях да блога раскрылі тайну: аказваецца, ты іграеш на гітары, пішаш песні...**

— Ёсць такое *(усміхаецца)*. У свой час скончыла музычную школу. Хоць быў момант, калі я ледзь не кінула школу на парозе атрымання дыплома. Проста прыйшла дадому і сказала: больш не хачу, надакучыла! Тады бацькі пайшлі на такую хітрасць: патэлефанавалі майму выкладчыку, папярэдзілі, з якім настроем я прыйду на наступны занятак, і папрасілі паўплываць на маё рашэнне. Калі я сустрэлася са сваім педагогам, ён сказаў мне самыя страшныя словы, якімі мяне можна проста «забіць»: «Так, Ёжыкава, я ад цябе такога не чакаў». Сказаць мне, што я здалася?! Тут я раззлавалася сама на сябе, вярнулася дадому і села рыхтавацца да экзаменаў. За два тыдні ўсё вывучыла і з горам папалам скончыла музычную школу.

Дагэтуль успамінаю некаторыя смешныя выпадкі са свайго музычнага жыцця. Напрыклад, неяк не хапала ў аркестры балалаечніка... І ўзялі мяне. Я, вядома, разумела, што гітара не вельмі адрозніваецца ад балалайкі: тут шэсць струн, а там — тры... Але хвалявалася, думала, што на фоне суладнага аркестра мая нязграбная ігра на балалайцы будзе вельмі чутная. І вось сяджу я на канцэрце, наярваю па струнах і разумею, што ўсе гукі зліваюцца ў адну мелодыю. Гэта было цудоўнае пачуццё.

Зараз я не прыгадаю музычныя творы, якія калісьці іграла, але гітара застаецца маёй вернай спадарожніцай па жыцці. З пятага класа пішу песні. Усе напарніцы па камандах заўсёды ведалі пра маё захапленне. Вельмі часта я прысвячала свае творы менавіта ім ды і проста блізкім сябрам.

**— Прызнайся, ты такая ж, як і твае прозвішча?**

— Калючая?

**— Так.**

— Па натуры я не канфліктны чалавек. Калі бачу, што можна пазбегнуць сваркі, стараюся прамаўчаць, не падкідваць дровы ў агонь. Але, калі мяне моцна зачапіць, магу і ўкалоць. Аднак сама болю на баюся. Буду ляцець галавой аб паркет, але ўстану і працягну гуляць. Гэтым я ў бацьку. Неяк нават быў смешны выпадак. На трэніроўцы падвярнула нагу, патэлефанавала бацьку, а ён стаў з мяне кпіць, маўляў, што так толькі я магу. Назаўтра даведваюся, што тата сам атрымаў пашкоджанне. Але самае смешнае высветлілася, калі я прыйшла да свайго фізіятэрапеўта. Сяджу, а ён за справамі кажа: гэтаму костку ўпраўляў, таго лячыў, а ўчора яшчэ гэты Ёжыкаў з траўмай. Мяне ледзь не раздзірае смех. Урач пытаецца: «Чаго ўсміхаешся?». Адказваю: «Я Ёжыкава». «А-а-а, дык гэта ў вас сямейнае...»

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

Свая тэрыторыя

# ФУТБОЛ НЕПРАФЕСІЯНАЛАЎ

**НЕ першы раз сябар запрашаў мяне паглядзець аматарскі футбол... На гэты раз знайшліся і час, і жаданне. Я стала відавочцам фінальнай гульні сезона — Суперкубка. У спартыўнай зале Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі сышліся дзве лепшыя на гэты момант каманды па вулічным футболе — «Дамастыль» (Маладзечна) і «Легіён» (Мінск).**

Арганізавалі гульню старшыня праўлення «Тэрыторыі футбола» Максім Курносаў, кіраўнік праўлення спаборніцтваў па міні-футболе Мікалай Курашэвіч і Раман Скяпко, капітан каманды «Дызель», якая таксама брала ўдзел у спаборніцтвах «Лігі міні-футбола».

Праз дваццаць секунд — першае парушэнне. Мяч кранууўся рукі аднаго з гульцоў «Дамастылю». Нягледзячы на недарэчнасць, каманда актыўна штурмавала вароты саперніка. І ў выніку — перамога ў першым і другім таймах.

«Дамастыль» заўсёды перамагае дзякуючы сваёй дысцыпліне і тэхнічным навыкам, — кажа Максім Курносаў. — У камандзе маладыя гульцы, якія проста не дазваляюць сабе права на памылку. Гэтая каманда яшчэ да матча была фаварытам, аднак «Легіён» не прайграваў у сёлетнім сезоне «Дамастылю» ні разу...

«Тэрыторыя футбола» аб'ядноўвае пяць чэмпіянатаў па ўсёй краіне, заўсёды збірае нямала аматараў вулічнага футбола. Тут не важна, колькі табе гадоў — галоўнае, каб ты мог паказаць прыгожую гульню. Толькі ў мінскай «Лізе міні-футбола» прымала ўдзел трыццаць каманд. Дарэчы, каб арганізаваць такое мерапрыемства, спатрэбілася нямала сіл і ўпартасці.

Паводле слоў Максіма, арганізаваць таварыскую гульню не складана. А вось для арганізацыі турнірнай гульні патрэбны час — каб усё прадумаць, з усімі дамовіцца. Арганізаваць чэмпіянат, які доўжыцца цэлы год, вельмі цяжка. Да кожнай каманды трэба знайсці свой падыход. Усіх трэба выслухаць і прыняць пэўнае рашэнне. А праца з людзьмі нездарма лічыцца адной з самых складаных. Не трэба забывацца і на пошук спонсараў. Аматараў футбола, вядома, шмат, але не кожны хоча ўкладваць грошы ў непрафесійны футбол. А знайсці добрую залу ці футбольнае поле без грошай — немагчыма. Расходы ледзь-ледзь пакрываюць тыя ўзносы, якія робіць кожная каманда перад гульнёй.

...Некаторыя з прысутных былі задзейнічаны ў працэсе ўзнагароджання. Хтосьці з іх атрымаў грамату, нехта медаль за максімальную колькасць забітых мячоў. Некаторым былі ўручаны падарункі ад спонсараў. «Дамастыль» жа атрымаў вялікі кубак за першае месца ў першым дывізіёне. Уся каманда пад эгідай капітана зрабіла рытуальны пераварот праз галаву, які азначаў перамогу. Гэта — візітная картка каманды. Для Максіма Курносава «Тэрыторыя футбола» — частка жыцця, без якой ён не можа сябе ўявіць. «На працягу шасці гадоў я звязваў сваё жыццё з аматарскім футболам, — успамінае Максім. — І гэты вынік з'яўляецца толькі штуршком для далейшых здзяйсненняў».

Арганізацыя аб'ядняла лепшыя аматарскія чэмпіянаты па ўсёй краіне, сфарміравала сетку турніраў. Так, спаборніцтва «Ліга міні-футбола», якое праводзіцца ў Мінску ўжо шэсць гадоў, зараз таксама знаходзіцца пад эгідай «Тэрыторыі футбола». Кожны ахвотны, незалежна ад узросту і прафесіі, мог сабраць каманду і зарэгістраваць яе да 1 жніўня. Такім чынам, 1 верасня пачнуцца спаборніцтвы. Звычайна яны плануюцца на суботы і нядзелі.

**Ганна БУРАК.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
30 08 2012 г.

# ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

Продавец — Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области

| Лот | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в агрогородке Раков, улица Набережная, 27 площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085715642000021. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется природный газ, подъезд, электричество | 42 000 000 | 4 200 000 |
| 2 | Земельный участок в деревне Дубоши площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085705601000069. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется асфальтированный подъезд, водопровод в деревне, расстояние от Ракова 10 километров | 18 000 000 | 1 800 000 |
| 3 | Земельный участок в деревне Шаповалы, уч. 21а площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085719601000039. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется электричество, подъездные пути. Удаленность от аг. Раков 20 километров, от г. Заславль — 8 километров | 22 000 000 | 2 200 000 |

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **05 октября 2012 года** (пятница) в 10.00 по адресу: агрогородок Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 01 октября 2012 года (включительно) до 17.00** по адресу: аг. Раков, пл. Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

**Контактные телефоны: (8 01772) 30 305; 8029 1405437.**
